Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Кавыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск. рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Змена адрасу: іншагародніх	— 20 к.
мясцовых	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нашпаралі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нашпаралі насьпрад тэксту 1 р. — к.
За радок нашпаралі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. ілогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрапуск. і чырвонадарожныя за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 226 (2414) Нядзеля, 30-га верасьня 1928 г.

Раскольнікам з КПЗУ ня месца ў шэрагах Камінтэрну.

Пастанова прэзыдыуму выканкому Камінтэрну па апэляцыі групы Васільківа, Туранскага і інш., выключаных з кампартыі Заходняе Украіны.

(Ухвалена 26-га верасьня 1928 г.).

Разгледзіўшы, водгук пастановы выканкому Камінтэрну ліст да VI кангрэсу выключанае з Камінтэрну IX пленумам выканкому Камінтэрну групы Васільківа, Туранскага, якая называе сябе ЦК КП Заходняе Украіны, прэзыдыум выканкому Камінтэрну адначае, што ліст пададзен людзьмі, якія ўжо 7 месяцаў назад парвалі з Камінтэрнам і ў працягу ўсяго далейшага часу ва ўмовах фашысцкае дыктатуры Пілсудзкага вялі антысавецкую агітацыю, зьвязаўшыся з міжнароднай трацкісцкай апазыцыяй, спрабавалі розным парадкам падарваць давер'е заходняўкраінскіх працоўных мае да СССР і Савецкай Украіны, да рабочае клясы Польшчы і яе кіраўніка—КПП і тым самым фактычна гралі ролю агентаў фашызму.

Прэзыдыум выканкому Камінтэрну адзначае, што ў лісьце групы Васільківа асуджанае ўсёй партыяй і прапоўнымі масамі Заходняе Украіны, няма ніякіх сьлядоў адмовы ад гэтае раскольніцкае, антыпартыйнае і антысавецкае дзейнасьці хоць-бы ў форме прызнаньня сваіх памылак; прэзыдыум выканкому Камінтэрну ня мае падстаў разглядаць ліст групы Васільківа інакш, як манэўр выпрабаваных палітычных інтрыгаў, якія летась чатыры разы ўрачыста ганьбілі нацыяналісцкія ўхілы нікчэмнае групы Шумскага ў КП(б) Заходняе Украіны, а потым зрабілі сабе з іх палітычны капітал, як'я ўхваляў дзесяткі разалюцый проці трацкізму, а потым заснаўвалі сувязь з трацкісцкай апазыцыяй пасьля выключэньня яе з Камінтэрну.

Прэзыдыум выканкому Камінтэрну ня можа мець даверу'я да групы Васільківа аб прыналежнасьці яе з Украінскай УсеКП(б) і КП Заходняе Украіны. Выканком Камінтэрну мае ліст Васільківа да канадзкіх таварышоў, якія сьведчаць аб процілеглым. Прэзыдыум выканкому Камінтэрну такоўма ня мае падстаў даверыць абяцанцы групы Васільківа падначаліцца ўсім пастановам выканкому Камінтэрну, пакуль гэтая група, не зважаючы на пастанову Камінтэрну аб яе выключэньні з камуністычных шэрагаў, ня спыніць існаваць, як арганізаванае цэлае, прыкрываючыся камуністычным сьцягам і вядучы барацьбу проці Камінтэрну, кампартыі Польшчы і КП Заходняе Украіны.

Бяручы ўсё гэта пад увагу, прэзыдыум выканкому Камінтэрну пастанаўляе адхіліць заяву групы Васільківа аб прыёме назад у Камінтэрн.

Наступ на рабочых у рэспубліцы Мюльлера.

БЭРЛІН, 29-9. Трацейскі суд ухваліў пастанову аб канфіскацыі ў сярэдня-нямецкай вугольнай прамысловасьці, выкліканым адмоваю рабочых ад тарыфнае згоды.

Пастанова трацейскага суду закранае 70 тысяч гарнякоў.

Пастанова прадугледжвае, што тарыфная згода павінна застацца ў моцы і пасьля 1-га кастрычніка 1928 г., аднак, з тымі зьменамі, што ўстанаўляемыя ёю тарыфы зьяўляюцца мінімальнымі, пастанова прадугледжвае павялічэньне заработку на 3 з пал. проц. Патрабаваньне гарнякоў, занятых на распрацоўках бурага вугалю, аб увядзеньні 8-мігадзіннага рабочага дню адхілена.

ПАЛОВЕ ЎСІХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ КРАЮ ПАГРАЖАЕ ЛЁКАУТ.

БЭРЛІН, 27-IX. Лёкаут 5 тысяч тэкстыльшчыкаў у Дурэне абвешчаны 29-га жніўня, ня спыняецца. Перамовы пакульшто не далі ніякіх вынікаў. Прадпрыймцы адхілілі патрабаваньне рабочых падвысіць заработак.

Бліжэйшымі днямі ліч лёкаутаваных рабочых павялічыцца да 46 тысяч, бо прадпрыймцы ў Мюнхэн-Клядбаху абвясьцілі, што яны 29 верасьня лёкаутуюць 40 тысяч тэкстыльшчыкаў, якія патрабуюць павялічэньня заработку.

Буйны канфлікт насьпявае і ў Саксоніі, дзе 30 кастрычніка канчаецца тэрмін тарыфнае згоды, якая датычыць 400 тысяч тэкстыльшчыкаў—аднае трэці ўсіх нямецкіх тэкстыльшчыкаў.

Заработак тэкстыльшчыкаў асабліва нізкі ва ўсходняй Саксоніі.

ШЭРАГІ НЯМЕЦКІХ МЕНШАВІКОЎ РАДЗЕЮЦЬ

МАСАВЫ ПЕРАХОД РАБОЧЫХ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАЎ У КАМПАРТЫЮ.

БЭРЛІН, 27-IX. Правінцыяльны камуністычны друк ня спыняе паведамляць аб новых выпадках масавага пераходу рабочых-членаў сацыял-дэмакратычнае партыі—у камуністычную партыю. У зьвязку з масавым пераходам, у Сярэдня-Рэйнскай акрузе ў апошні час было заснавана 10 новых мясцовых арганізацый камуністычнае партыі. Вельмі шмат хто з пераходзячых былі членамі сацыял-дэмакратычнае партыі ў працягу 10-20 гадоў.

ЗАКОНАПРАЭКТ МЕНШАВІЦКАГА ЎРАДУ ПРОЦІ КАМПАРТЫІ.

БЭРЛІН, 27-9. Міністэрства юстыцыі падало ў рэйгстаг законапраэкт аб выдачы злачынцаў; у праэкце прадугледжваецца таксама выдача асоб за палітычныя справы „ў выпадку, калі ўчынак абвінавачанага зьяўляецца, пасьля разгляду ўсіх акалічнасьцяў, асабліва ганебным“.

Забастовачная хваля ў Францыі.

ПАРЫЖ, 28-9. Водгук паведамленьняў „Юманітэ“, у Лілі, не зважаючы на тое, што забастоўка пакуль-што не абвешчана, фактычна ўжо бастуе 4.000 тэкстыльшчыкаў. У мясцовасьцях, ахопленых забастоўкаю, становішча бліз зьмен.

Дэлегаты рэфармістаў, на чале з Жуо паведалі Пуанкарэ. Дэлегаты так званых аўтаномных прафсаюзаў на чале са Шмідтам, прасілі Лушэра ўзяць на сябе пасрэдніцтва ў перамовах з прадпрыймцамі.

СТАЧКА БАРДОСКІХ ГРУЗЧЫКАЎ.

ПАРЫЖ, 27-9. У Бардо не разгружваецца і не нагружваецца блізка 30-ці суднаў, якія стаяць на рэйдзе і знаходзяцца ў порце, з прычыны забастоўкі 1500 докераў.

* * *

ПАРЫЖ, 28-9. Да забастоўкі докераў у Бардо далучыліся докеры порту Пайяк. Чыгуначнікі ў Бардо адмовіліся працаваць у порце замест бастуючых докераў.

ПЕРШЫ ВЫХАД АПЭРЭТАЧНАГА КАРАЛЯ

РЭПРЭСІІ АХМЭТА-ЗОГУ ПРОЦІ „НЕПАКОРНЫХ“.

ВЕНА, 25-9. Аўстрыйскі афіцыёз „Рэйхс Пост“ паведамляе, што албанскі ўрад канфіскаваў усю маёмасьць ранейшага міністра фінансаў Чоба, які адмовіўся сказаць прамову ў чэсьць новага караля.

ЗОГУ ПРЫЗНАНЫ ЎСІМІ «ВЯЛІКІМІ» ДЗЯРЖАВАМІ.

ВЕНА, 26-9. Як паведамляюць з Тыраны, прадстаўнікі Англіі, Францыі, Нямеччыны і Румыніі ў Тыране паведамілі албанскі ўрад, што іхнія ўрады прызнаюць Зогу каралём Албаніі.

АЎСТРАЛІЙСКІЯ ТРАНСПАРТНІКІ ПЕРАЙШЛІ Ў НАСТУП.

ЛЁНДАН, 28-9. Агенцтва Рэйтар паведамляе з Мэльбурну: „Сёньня ў кватэры старшыні дзьвюх параходных кампаній былі кінуты бомбы. Бомбамі пашкоджаны будынкі. З людзей ніхто не пацярпеў“.

„АПЕКА“ НАД АЎСТРАЛІЙСКІМІ ТРАНСПАРТНІКАМІ.

ЛЁНДАН, 27-9. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Мэльбурну (Аўстралія): Рада аўстралійскіх прафсаюзаў ухваліла рэзалюцыю, якая ганьбіць закон аб транспартных рабочых, прыняты гэтымі днямі аўстралійскім фэдэральным парляментам (гэты закон загадвае ўсім транспартным рабочым выбіраць спэцыяльныя ліцэнзіі, якія даюць права на працу, і дазваляе ўраду ахоўваць працу штрэйкбрэхераў).

Рада прафсаюзаў у Сідней ўхваліла рэзалюцыю, у якой заклікае ўсіх рабочых марскога транспарту адмовіцца ад выбаркі ліцэнзій, прадугледжаных законам аб транспартных рабочых».

Шырокі байкот японцаў у Кітаі.

ШАНХАЙ, 28-IX. Японскі консул у Шанхаі зьвярнуўся да шанхайскага камісара нанкінскага ўраду па замежных справах з афіцыйным лістом, у якім зазначае на ўзмоцнены анты-японскі байкот. Консул кажа, што ў апошні час праводзіцца ня толькі байкот японскіх тавараў, але і ўзьнікае новы «дзіўны» рух, які агітуе за забарону вывазу рысу ў Японію. Ліст канчаецца заявай, што „калі забарона вывазу рысу ня будзе скасавана, дык ад гэтага сур'ёзна пакерпіць нанкінскі ўрад“.

СТАЧКА ШАНХАЙСКІХ ДРУКАРОЎ.

ШАНХАЙ, 28-9. 3000 рабочых шанхайскіх друкарань абвясьцілі забастоўку, патрабуючы адзавіць на пасадзе двух незаконна звольненых рабочых.

Рэпрэсіі проці чэхаславацкае кампартыі.

ПРАГА. 27-9 Учора паліцыя канфіскавала палком увесь выпуск чарговага нумару органу чэха-славацкае кампартыі „Руде-Права“. Мяркуюць што нумар канфіскован за зьмяшчэньне прамовы камуністычнага сэнатара Хлумецкага аб росьце дарагоўлі і аб гвалтоўных учынках паліцыі Прыкарпацкае Русі.

Польшча коціцца да манархіі

Выпрацоўка праэкту ліквідацыі парлямантарызму.

Сэкрэтная нарада кіраўнікоў урадавага блёку.

ВАРШАВА, 28-IX. Орган ППС "Работнік" паведамляе аб сэкрэтнай нарадзе скліканай беспартыйным блёкам супрацоўніцтва з урадам, на якой абмяркоўвалася пытаньне аб зьмене польскае канстытуцыі. Газэта знаходзіць, што, мяркуючы па складзе нарады, яна была вельмі аўтарытэтнаю. У ёй бралі ўдзел намесьнік міністра юстыцыі Цар, дэпутат Касьцялкоўскі, начальнік усходняга аддзелу міністэрства замежных спраў Галуўка, дэпутат Ян Пілсудзкі (брат Пілсудзкага), князь Радзівіл і інш.

Водлуг слоў газэты, усе пляны зьмены канстытуцыі, разгледжаныя на гэтай нарадзе, накіраваны ў бок адмовы ад дэмакратычных інстытутаў і поўнае ліквідацыі значэньня парляманту. Вельмі характэрныя погляды Галуўкі, які яшчэ нядаўна быў выдатным членам ППС. Ён заявіў на нарадзе, што парляманцкі парадак кіраваньня вычарпаў сваю гістарычную ролю. Галуўка нічога ня меў-бы проці таго, каб кіраўніку дзяржавы—прэзыдэнту—быў нададзен тытул караля. Галуўку наогул выказаўся за абраньне прэзыдэнта на ўсё жыцьцё.

Водлуг слоў газэты, усе прамоўцы выказаліся за тое, што парлямант належыць падначаліць прэзыдэнту.

Авантурнасьць прамовы Юзэфскага пацьвярджаецца.

ВАРШАВА, 28-9. Дэпутат беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам Валашынеўскі, які быў старшынёю на тэй самай нарадзе дэпутатаў і сэнатараў, дзе выступаў з сваёй вядомай прамовай валынскі ваявода Юзэфскі, зьмясьціў у афіцыёзе «Глос Правды» артыкул; гэты артыкул зьяўляецца нібы адхіленьнем адхіленьня ПАТ'а наконт прамовы Юзэфскага. Палемізуючы з газэтай «Газэта Варшаўска», якая зганьбіла прамову Юзэфскага, Валашынеўскі піша: «Лічу сваім абавязкам устанавіць ня толькі тое, што ўся прамова ваяводы, уключаючы і месцы, прыведзеныя аўтарам артыкулу „Газэта Варшавска“, была ўхвалена ўсімі ўдзельнікамі нарады з поўным прызнаньнем, але і тое, што ўсе дэпутаты і сэнатары выступаўшыя пасьля ваяводы, цалкам падтрымалі яго».

Прыгавор па справе членаў ЦК КПЗБ.

26 верасьня г. г. вечарам віленскі акруговы суд вынес прыгавор па справе членаў ЦК КПЗБ. П. Цьвяткоў, Гэльлор, Шварц і Розін прыгавораны на 10 гадоў катаржнага астрогу, Кэнігсбэрг і Кравец на 5 г., Гай—на 4 г., Сэгаль, Бэры і Адзінова апраўданы.

Выслухаўшы прыгавор, засуджаныя выказалі бурны пратэст. Паліцыя выдаліла публіку з залі.

Пасольскі мітынг у Браслаўі.

8 верасьня г. г. у м. Браслаўі адбыўся справаздачны мітынг, на якім выступаў прадстаўнік бел. сялянскага саюзу пасол К. Юхневіч. Прадстаўнік Браслаўскага староства некалькі разоў перарываў пасла, забараняючы гаварыць аб выбарных злоўжываньнях, нізкім узроўні навучаньня і польскіх школах.

Арышты студэнтаў.

«Кур. Віл». (№ 221) паведамляе, што на польска-савецкім пагранічча паліцыя арыштавала двух варшаўскіх студэнтаў, якія быццам ялі на пагранічча камуністычную агітацыю, адначасова заклікаючы моладзь, каб яна выяжджала ў Менск вучыцца.

Зьезд вызваленцаў.

У лістападзе г. г. у Вільні адбудзецца зьезд дэлегатаў з партыі «Вызваленьне», якое ўсё больш трацінь уплывы сярод вёскі. Дэлегаты зьбяруцца з Віленскага, Навагрудзкага і Беластонкага ваяводзтваў. На гэты зьезд мае прыбыць Тугут.

Лёзунг самакрытыкі і наша прэса.

Прамова т. Яраслаўскага на усесаюзнай нарадзе рэдактароў.

Друк ня толькі павінен асьвятляць кепскія вучастні нашае працы, але і паказваць, як выправіць кепскае. Толькі тады друк выканае поўнасьцю сваю задачу.

Наш друк—прадукт творчае волі мас.

МАСКВА, 28-9. На вячэрнім пасяджэньні ўсесаюзнае нарады рэдактароў 22-га верасьня з прамоваю выступіў т. Яраслаўскі.

Спыняючыся на характары нашага друку, т. Яраслаўскі падкрэсьліў, што гэта ня толькі друк для мас, але гэта друк, у якім масы ўсё больш і больш самі бяруць удзел. І вось,—гаворыць Яраслаўскі,—лёзунг самакрытыкі каштоўны асабліва таму, што дае магчымасьць куды больш шырокім масам, чым гэта было дасюль, увяць удзел у крытыцы недахопаў нашае працы і ў зьнішчэньні іх. Калі мы абмяжуемся толькі тым, што друк будзе накіроўваць прамені свайго пражэктару то на той, то на гэты вучастак, і нават выбіраць паўмысьле, з вядомага пункту гледжаньня, найбольш кепскія вучасткі нашае працы, але разам з тым, ня будзе даваць даклалных зазначэньняў, як-жа іх выправіць, дык тады друк выконвае толькі адну частку працы, праўда, вельмі важную частку, але ўсё-ж далёка ня тую задачу, якую ён павінен выканаць.

Я ня згодзен з думкаю тых, хто думае, што мы зараз, як гаворыцца ў адным артыкуле—„уступілі ў шырокае разводзьдзе самакрытыкі“. Такога разводзьдзя яшчэ няма. Масы яшчэ баяцца як сьлед крытыкаваць (галасы: правільна), бо ёсьць шмат фактаў, якія паказваюць, што дзе-ні-дзе імкнуцца ўсялякім чынам абмежаваць гэтую самакратыку.

Ня ўмеем асьвятляць нашых дасягненьняў.

Праўда, тое, што адрозьнівае наш друк, тое, што адзначаюць нават чужаземцы,—гэта сапраўды яго вельмі востры крытычны тон у адносінах да нашых недахопаў. Ні адна ўрадавая партыя ніколі так бязьлітасна не адносіцца да сваіх недахопаў і недахопаў дзяржавы, як мы. Адмоўныя факты нашае сапраўднасьці ў нашым друку выяўляюцца так густа, што здаецца вічога другога няма, апрача гэтых адмоўных фактаў. Я думаю, што ўсё-ж гэта ёсьць адзін з недахопаў нашага друку. У нас яшчэ ёсьць шмат прыкладаў станоўчага, добрага, якога мы ня ўмеем асьвятліць і паведаць. Некаторыя спробы ў гэтых адносінах робяцца, але гэтыя спробы куды менш сыстэматычныя, чымся спробы паведаць аб тых агіднасьцях, якія ў нас ёсьць. Калі ў нас бывае што-небудзь добрае, дык яно зьменчана ў нас звычайна дзе-небудзь на задворках, нібы мы саромімся зараз сказаць, што ў нас ёсьць што-небудзь добрае.

Потым,—кажа далей т. Яраслаўскі,—я бы хацеў зьвярнуць увагу на два бакі працы нашага друку, гэта—самаправерку. Тав. Мяркундаў, зьяўляючыся старшынём гарсавету абразіўся, што ў ім бачаць «корань прычыны». Ён сам можа крытыкаваць сэкцыі, але як той, ці іншы можа казаць, што ён, сам старшыня, выдаваты і што вінаваты прэзыдыум гарсавету? Я думаю, таварышы, што ЦК і ЦКК дзеля будучага трэба ўхваліць такую пастанову: калі ёсьць пастанова ЦК аб самакрытыцы, дык вы, акругком, будзьце ласкавы, ня выдумвайце сваіх асобных дырэктываў (з месц: правільна. Воплескі), выконвайце тыя дырэктывы, якія вам далі, бо нічога повага яны ня выдумаюць.

Я думаю, што калі казаць аб прасьледаваньнях друку,—а яны ёсьць і з імі трэба з найбольшаю суровасьцю змагацца, і мы ўхваляем найбольш суровую рэзалюцыю наконт гэтага, якую мы будзем няўхільна праводзіць,—дык, з другога боку, нашая вялікая адказнасьць у гэтым пытаньні патрабуе таго, што ня можна дапускаць, каб працаўнікі друку на старонках друку выступалі з заметкамі, якія іншы раз вакіраваны проці рабочае дысцыпліны. А такія факты ёсьць. На пленуме ЦКК паведамлен выпадак, калі на старонках друку бароняць такія мерапрыёмствы, якія цалкам ідуць проці волі рабочых у зьвязку з рацыяналізацыяй, калі асобная група змагаецца праз друк за такія мерапрыёмствы, якія, бязумоўна пярэчаць інтарэсам прамысловасьці ў цэлым, а таксама і інтарэсам рабочае клясы. Само сабою зразумела, што такіх людзей, якія спрабуюць стрымаць друк і зрабіць яго ціхім і спакойным, каб ён усё данасоўваў, каб выконваў толькі мясцовыя дырэктывы,—трэба сурова караць і нават звальняць з працы.

Адхіленьні ў друку.

Потым ідзе тое, што адзначаў пленум ЦКК, а іменна—аб безадказным апаганьваньні гаспадарцаў. Тут мы ўпіраемся шчыльна ў пытаньне аб такзваных адхіленьнях. У гэтых адносінах у нас вялікі зажым. (Голас з месца: з якога боку?). Я ўяўляю справу такім парадкам: згодзімся, напрыклад, што той, хто адхіляе, няправы, што ён свае тлумачэньні дае ня зусім правільна. Тады-ж вы можаце гэты матар'ял перадаць больш кампэтэнтнаму органу, пасьля таго, як вы назвалі яго, прыкладна, жулікам, а ён адхіляе гэта і гаворыць, што на справе было так-та і так-та. Пасьля гэтага, калі надрукавана і тое і іншае, і вашае абвінавачаньне і яго апраўданьне, перадайце ўсё гэта кампэтэнтнаму органу—ці КК, ці РСІ, ці судоваму органу. І калі потым выявіцца, што ён напісаў няправільна, што ён спрабаваў увесьці грамадзкую думку ў аблуду, дык ён ужо адказваць за гэта будзе больш. Але, ва ўсякім разе, трэба даць яму магчымасьць апраўдацца.

У канцы т. Яраслаўскі зазначыў, што ў правядзеньні самакрытыкі трэба прытрымліваца вядомага пляну. Ня трэба раскідацца. Трэба згуртоўвадь увагу на пэўных пытаньнях і даводзіць справу да канца.

крытыка зьверху і крытыка зьнізу.

Што датычыць крытыкі зьверху, дык яна ў агульным ідзе больш ці менш добра. Калі-ж справа ідзе аб крытыцы зьнізу, дык тут больш пастарожанасьці. Я самым рашучым чынам проці таго, каб кожную заметку, усякае паведамленьне, якое пацьвярджаецца вельмі часта нават прысланым пры ёй матар'ялам, напрэдне яшчэ пасылаць на праверку ў тую ці іншую кантрольную камісію, ці ў які-небудзь іншы орган, каб потым, калі гэта справа будзе праверана, праз месяц-два зьявілася якая-небудзь куцая заметка аб гэтым. Гэта было-б абсалютна няправільна. Калі мы хочам дазволіць крытыку зьнізу, дык мы павінны мець на ўвазе, што ў нас будзе вядомы процант памылак. Вось у „лістоўцы РСІ“, якую мы выдаём пры «Правде», у нас 6 проц. заметак не пацьвярджаецца з таго, што мы зьмяшчаем, і былі вельмі няпрыемныя памылкі. Напрыклад, паведамленьне аб кендыру, было зусім няправільным. Выяснілася, што гэтую заметку прынёс чалавек, зацікаўлены ў тым, каб вывіць гэтую справу з кепскага боку. Мы тут зрабілі памылку, але такія памылкі зусім няўхільны ў друку. Калі мы хочам сказаць, што друк не павінен рабіць ніводнае памылкі, бо памылкі друку робяцца памылкамі ўсіх тых, хто ўсвайвае гэтую памылку, робяцца памылкаю мас, дык тады мы ставім друк у вельмі цяжкае становішча.

Цяпер наконт таго, каб крытыкаваць, не зважаючы на асоб. Гэта ёсьць тое, што мы патрабуем, а іменна—каб магчыма была самая шырокая крытыка зьнізу. Зразумела, гэтакая крытыка патрабуе вельмі вялікае асьцярогі. У нас часта бывае такі размах, які ня ведае ніякіх межаў. Калі ў нас здарылася «шахцінская справа», дык кожная арганізацыя шукала ў сябе таксама шахцінскую справу, як гэта ў свой час было «з дымаўкаю». Выкрылі «смаленскую скулу“—і ў нас, вось, ёсьць «смаленская скула». Гэта нібы рабіла вялікую прысмнасьць.

Часам на мясцох разумеюць самакрытыку „пасвойму“.

Наконт прасьледваньняў. Я маю шмат даных, мне прысылалі аб іх асобныя газэты. З інфармацыйнага аддзелу ЦК мне прысылалі матар'ялы аб прыцягненьні да адказнасьці рэдакцыі газэты «Власть Труда» (Уладыкаўказ) за крытыку працы прэзыдыуму гарсавету. Старшыня гарсавету Мяркундаў зьмясьціў у газэце артыкул. У адказ зьмяшчаецца артыкул т. Рынкевіча: „Дзе корань прычыны“? Аўтар зазначае, што корань прычыны ў надзвычайнай інэртнасьці і пасыўнасьці членаў гарсавету, і што гэтыя прычыны трэба шукаць у самым прэзыдыуме горсавету, адкуль і пачаць.

Амэрыка асудзіла англа-францускую згоду.

Адказ Вашынгтону на ангельскую ноту.

ЛЁНДАН, 28-9. Агенцтва Рэйтар паведамляе: „Перададзены сёньня ангельскаму міністэрству замежных спраў адказ-нота ўраду Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў наконт англа-францускае марское згоды, заяўляе, што гэтая згода ня выкананае, як відаць, ніводнае з тых умоў, якія, на думку ўраду Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, зьяўляюцца жыцьцёвымі. Як відаць,—гаворыцца ў ноце,—адзінымі катэгорыямі суднаў, якія англа-француская згода прапануе абмежаваць, зьяўляюцца крэйсэры з таннажам у 10 тысяч тон і ніжэй, узброеныя гарматамі калібру больш 6 дулаў і да 8 дулаў, а таксама падводныя лодкі з таннажам звыш 600 тон. Урад Злучаных Штатаў лічыць, што абмежаваньне марскіх узброеньняў, каб быць сапраўдным, павінна распаўсюдзіцца на ўсе катэгорыі баявых суднаў. Абмежаваньне-ж толькі вышэйпаказанае катэгорыі крэйсераў накладае абмежаваньне толькі на тыя тыпы суднаў, якія сьвецільна надыходзяць для патрэб Злучаных Штатаў. Як відаць, што абмежаваньне гэтага тыпу суднаў навялічыла-б у надзвычайнай меры магутнасьць наступу дзяржавы, якая ўладае буйным камэрцыйным флётам, на суднах якога могуць рабіцца ў мірны час падрыхтаваньні для ўстаноўкі 6-ніцавых гармат. Гэтая прапанова вынікаецца яшчэ больш непажаданаю, чымся прапановы ангельскае дэлегацыі на канфэрэнцыі 3-х марскіх дзяржаў.

Далей нота пярэчыць проці таго, што падводныя лодкі з таннажам ніжэй 600 тон застаюцца без абмежаваньняў, і гаворыць, што Злучаныя Штаты, супольна з усімі дзяржавамі, з ахвотаю зьніччылі б усіх падводны флёт; але калі падводныя лодкі павінны існаваць, дык, на думку ўраду Злучаных Штатаў, падводны флёт павінен быць разумна абмежаваны па таннажу, і падводных лодках, ці па іх ліку.

Урад Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў,—заяўляе нота,—лічыць, што англа-француская згода, пакідаючы без абмежаваньняў досыць значную частку флёту і так многа тыпаў вайсковых суднаў, будзе тым самым актыўна спрыяць крушэньню аспонае маты ўсякае канфэрэнцыі аб разброеньні; затым урад Злучаных Штатаў лічыць, што ўхвала англа-францускіх прапаноў у якасьці асновы для дыскусіі не паслужыла-б ні для якае карыснае маты.

Урад Злучаных Штатаў ніяк не пярэчыць проці подпісаньня Англіяй і Францыяй любое згоды, якую яны лічаць карыснай у інтарэсах абмежаваньня ўзброеньняў, але ён ня можа згадзіцца з прыстасаваньнем такое згоды да сябе. Згода можа быць дасягнута праз наданьне дзяржавам права зьмяняць пропарцыя суадносіны між таннажам розных катэгорый суднаў у межах агульнага таннажу. Калі-б з боку Англіі была выступна прапанова ў гэтым напрамку, дык Злучаныя Штаты са спачуваньнем разглядзелі-б яе».

Нарады Пілсудзкага з румынскім генштабам.

ВЕНА, 27-IX. Як паведамляе вэнгерскі друк, Пілсудзкі прыехаў у Глаўзэнбург і меў там перамовы з румынскім вайсковым міністрам і іншымі слябарні румынскага ўраду.

Румынскі ўрадавы друк агалашае тэлеграму надыходзячага афіцыйнага прыёму Пілсудзкага ў Бухарэсьце. Спасылаючыся на надзейныя крыніцы, аўстрыйскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што ў часе афіцыйнага візыту ў Бухарэст Пілсудзкі будзе весьці далей свае перамовы з румынскім вайсковым камандаваньнем.

Ляск зброі румынскіх мілітарыстаў.

ВЕНА, 28-IX. Абмяркоўваючы спрэчкі аб разброеньні на пленуме Лігі Нацый, румынкі афіцыёз „Эндэпэндэнс Румэн“ заяўляе, што «Польшча і Румынія ніколі ня згодзяцца скарацінь свае арміі да тае пары, пакуль СССР не абавяжацца правесьці тое-ж самае і ў сябе. Польшча і Румынія гатовы разброіцца толькі ў тым выпадку, калі інтэрнацыянальная сіла забясьпечыць іх бясьпечнасьць у той-жа меры, як і іх нацыянальная ўзброеная сіла, ад якое яны адмовяцца ў выпадку разброеньня. Аднак, у сучаснай Эўропе няма ў наяўнасьці такое сілы, Ліга Нацый ня мае арміі.

Сучасная кантынэнтальная сыстэма ўгаворай аж да Малое Антанты ўключна, ня досыць надзейна проці магчымага нападу з боку СССР. Вопыт Румыніі ў часе сусьветнае вайны падцьвердзіў, што Румынія ў выпадку вайны ня можа цалком спадзявацца на дапамогу ў дастаўцы амуніцыі з боку саюзьнікаў. Таму яна прымушана разьвіць сваю армію да найвышэйшага ўзроўню тэхнічных дасягненьняў».

РУМЫНСКІЯ МАНЭЎРЫ НА МЯЖЫ З СССР.

ВЕНА. Бухарэсцкія газэты з Ясаў паведамляюць, што асеньнія манэўры румынскае арміі адбудуцца між 1-м і 17-м кастрычніка. Згрупаваньне войска ўжо распачалося.

РУМЫНІЯ ТРАЦІЦЬ СВАЮ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ.

ВЕНА, 27-9. Водлуг паведамленьняў з Бухарэсту, пры перамовах ў Лёндане і Парыжы аб дачы пазыкі Румыніі ўзьніклі новыя цяжкасьці. Ангельскія банкі ставяць наданьне пазыкі ў залежнасьці ад забясьпечаньня інтарэсаў ангельскага капіталу ў Румыніі праз перагляд румынскага эканамічнага законадаўства. З францускага боку таксама патрабуюць адмены шмат якіх законадаўчых пастаноў, якія разглядаюцца францускімі капіталісцкімі коламі, як „перашкода да працы чужаземнага капіталу ў румынскай нафтавай прамысловасьці“.

Проці душыцеляў румынскага пралетарыяту.

МІТЫНГ ПРАТЭСТУ У БЭРЛІНЕ.

БЭРЛІН, 27-9. Учора адбыўся, скліканы нямецкай сэкцыяй МОПР'у і ЦК Міжрабпому, масавы сход пратэсту проці кляўзэнбурскага працэсу 114 румынскіх рэвалюцыйных дзеячоў. Выступіўшы з дакладам камуністычны дэпутат рэйхстагу Мюнцэнберг адзначыў ролю такіх палітычных працэсаў на Балканах, у Польшчы і ў імперыялістычных дзяржавах у падрыхтоўцы вайны проці СССР. Англія ня можа зараз мабілізаваць вялікія арміі проці СССР, таму яна абавязвае дзяржавы, якія знаходзяцца на захад ад СССР, быць настаўшчыкамі пралетарскіх мас у якасьці гарматнага мяса і стаць плядардамі для наступу проці СССР. Менавіта, таму вассальныя краі Англіі вядуць усімі сродкамі барацьбу проці рэвалюцыйнага рабочага руху, які адзін можа перашкодзіць ангельскім плянам. Гэта адзіная прычына для кляўзэнбурскага працэсу.

Выступіўшы ўслед за Мюнцэнбергам абаронца Ірэйс зазначыў на неабгрунтаванасьць кляўзэнбурскага працэсу нават з пункту гледжаньня буржуазнага правасьвядомасьці.

Сход адчазгодна ўхваліў рэзалюцыю пратэсту проці кляўзэнбурскага працэсу і пастанавіў паслаць дэлегацыю ў румынскае пасольства ў Бэрліне для падачы пратэсту проці тэрору румынскае клясавае юстыцыі.

Уражаньні сэнатара Эвэрта аб СССР.

ВАРШАВА, 28-9. Афіцыёз «Глос Правды» і орган вайсковага міністэрства „Польска Збройна“ агалашаюць гутарку з членам дэлегацыі польскіх прамыслоўцаў у СССР—сэнатарам Эвэртам. Эвэрт апісвае Ніжагародзкі кірмаш і прамысловыя цэнтры СССР, якія наведала польская дэлегацыя. Эвэрт выказвае ўпэўненасьць, што сучасная кан'юктура спрыяе ўмацаваньню гандлёвых адносін між Польшчаю і СССР. Недавер'е, якое выказваюць польскія дзелавікі да СССР, ён лічыць неабгрунтаваным. Бяручы пад увагу, што з боку СССР у якасьці манапольнага пакупца выступае Народны Камісарыят Замежнага Гандлю, трэба, каб польскія прамыслоўцы аб'ядналіся і арганізавалі экспартныя сындыкаты для асобных галін прамысловасьці. Асабліва пазіны заснаваць такі сындыкат тэкстыльныя прамыслоўцы.

У заключнай частцы гутаркі Эвэрт спыніўся на дасканалым абсталяваньні Ленінградзкага порту і на посьпехах польскіх канцэсійных прадпрыёмстваў у СССР. Ад адказу на палітычныя запытаньні Эвэрт ухіліўся. Ён падкрэсьліў, аднак, дасягненьні СССР у галіне сацыяльнага забясьпечаньня і з захапленьнем гаварыў аб дзяржаўным інстытуце аховы мацярак і дзіцяці, а таксама аб камуне ранейшых крымінальных злачынцаў пад Масквою.

У Літве.

Адстаўка міністра шляхоў.

КОЎНЯ, 28-9. Водлуг паведамленьняў афіцыёзу „Летувос Айдас“, прэзыдэнт задаволіў хадайніцтва міністра шляхоў Чурліёні аб адстаўцы.

Падпалы фальваркаў.

Віленскія польскія газэты паведамляюць, што апошнімі днямі ў Літве мелі месца падпалы асяродкаў распарцэляваных польскіх маёнткаў, дзе да апошніх дзён пражываюць яшчэ паляні. Пажары выбухаюць выключна ў стадолах, у якіх сабраны ўраджай гэтага году. Польскія газэты прыпушчаюць, што падпалы робяцца арганізацыяй „Жалезны Воўк“ і маюць оваею мэтаю зьнішчэньне польскай уласнасьці

Арышты палякаў.

Гэтымі днямі каля Кальварыі ліцьвіны арыштавалі ўласьніка фальварку Ігнат

Выданьне твораў У. І. Леніна на беларускай мове.

Даклад тав. Ігнатоўскага на трэцяй сэсіі ЦВК БССР VIII скліканьня.

Аб значэньні выданьня твораў У. І. Леніна на беларускай мове ніпе тут ня прыходзіцца гаварыць. Гэта рэч вусім ясная і ўсім нам вядомая.

Я павінен толькі падкрэсліць тое, што беларуская культура атрымае з выданьнем твораў Леніна на беларускай мове такі каштоўны ўклад у Кастрычнікавую рэвалюцыю, які робіць беларускую культуру ў даны момант, я бы сказаў такой, якая стаіць на адной ступені з вельмі высокімі культурамі. Бо ўсім нам, таварышы, вядома, што тэорыя Леніна ў беларускай культуры—гэта ёсьць той здабытак астатніх дзён Кастрычнікавай рэвалюцыі, вышэй якога, вядома, няма.

Праца па выданьні твораў У. І. Леніна на беларускай мове пачалася з 1924 г. Была створана камісія, якая потым ператварылася у рэдакцыю, але трэба было адразу прыступіць да рэдагаваньня, вось чаму фактычна існуе рэдакцыя па выданьню твораў Леніна.

Гэтая рэдакцыя прыцягвае да працы ўсе ўстановы, якія ёй патрэбны. Пры рэдакцыі існуе спэцыяльная стылістычная камісія, бо тут трэба зьвярнуць вялікую ўвагу на самы стыль, па форму, на гэта-ж пераклад. У стылістычную камісію мы прыцягваем самых лепшых знатакоў мовы.

Праца ўвязана з цэлым шэрагам устаноў, заслухоўвалася ў цэлым шэрагу інстытуцый, у тым ліку і Прэзыдыум ЦВК некалькі разоў нікавіўся і прымаў справаздачу камісіі, дапамагаў сваімі пастановамі зьнішчыць некаторыя нашы недахопы і г. д.

Паміж камісіяй і Інстытутам Беларускай Культуры ёсьць увязка. Раней гэта ўвязка была фактычнай, зараз яна ўжо яўляецца арганізацыйнай, бо Інстытут навуковай мовы пры Інбелкульце дапамагае перакладу.

Што датычыцца самай працы, то, вядома, праца цяжкая. Калі вы прымеце пад увагу глыбіню сучаснай тэорыі рэвалюцыйнага марксызму, якую дае Ленін, калі прымеце пад увагу багацьце думак Леніна, калі прымеце пад увагу, што Леніна трэба перакладаць так, каб перакладам не сапсаваць арыгіналу, то вы зразумееце, што так слабодна перакладаць Леніна, як таму ці іншаму перакладчыку падабаецца, нельга. Трэба вельмі дэталёва капацца ў рукапісах, трэба вельмі дэталёва капацца ў тых даных, якія мы маем.

Мы павінны адзначыць, што першае выданьне твораў Леніна па расейскай мове, ня гледзячы на тое, што над гэтым выданьнем шмат народу сядзела і доўга сядзела,—усё-ж такі мае ў сябе памылкі.

Ясна, што багацьце думак Леніна, дакладнасьць фармуліровак—усё гэта прымушае нас быць вельмі ўважлівымі да гэтага перакладу. А калі вы яшчэ дадасьцё, што ў нашай беларускай мове зараз ня ўсё распрацавана ў тэрміналёгіі, у зваротах рэчы, бо толькі Кастрычнікавая рэвалюцыя зрабіла беларускую мову—мовай дзяржаўнай, мовай культурных устаноў, мовай гаспадарчых устаноў,—то самі зразумееце, як часам бывае цяжка працаваць.

У Леніна вельмі багатая расейская мова; скажам, некалькі слоў вызначаюць адну і тую-ж, здаецца, думку, а калі звернемся да беларускай мовы, там часам няма такога багацьця мовы, такіх адценкаў, якія ёсьць у Леніна. Вось чаму часам прыходзіцца рабіць наватвор, г. значыць, такое слова, якога няма зараз у беларускай мове; але гэты наватвор рабіць рызыкоўна, бо калі мы ўвядзём такія словы, якія не практыкуюцца ў беларускай мове, то гэта прывядзе да таго, што беларускія працоўныя масы ня будуць добра разумець Леніна.

Значыць, тут трэба быць вельмі і вельмі асьцярожным. У наватворах трэба чэрпаць матар'ял з асноўнай крыніцы—народнай мовы. Праўда, гэтая крыніца пашырылася: мы маем у Інбелкульце некалькі тысяч слоў, сабраных Бюро Краязнаўства, але гэтых слоў не хапае. Значыць, для таго, каб перакласьці творы Леніна, трэба памятаць, што яго тэорыя зьвязана з практыкай нашага будаўніцтва, а ў гэта будаўніцтва ўцягнуты шырокія колы рабочых і сялян.

Усё гэта прымаем пад увагу.

Ясна, мы сваімі слабымі сіламі ня можам так хутка пасьпяваць з працай выданьня твораў Леніна, як гэта робіцца ў Маскве. Тым ня менш мы сувязь устанавілі са ўсімі тымі інстытуцыямі, якія вывучаюць Леніна. Тав. Сэрбэнта нераз езьдзіў у Маскву; там таксама ставіўся даклад нашай камісіі ў Ленінскім Інстытуце, і Ленінскі інстытут дапамагае нам у нашай працы. Завязана сувязь з Украінай, Нямеччынай.

Што намі зроблена?

Мы выдалі папулярныя творы Леніна ў асобных кніжачках. Усяго з 1924 году да гэтага часу мы выдалі ўжо 22 назвы, якія складаюць 95 друкаваных аркушаў. Такім чынам, у сярэднім кніжачка ў нас выходзіла ў 2-3 аркушы. Праўда, некаторыя з гэтых кніжачак займаюць 6 аркушаў, адна 15, адна нават 20 з паловаю аркушаў, так што ў першую чаргу мы заняліся выданьнем папулярных твораў Леніна. І толькі з 1926 году мы ўжо прыступілі да падрыхтоўкі выданьняў збору твораў Леніна.

Мы гаворым—збор твораў Леніна, а ня „поўны збор твораў Леніна", бо той збор твораў Леніна, які зараз выдаецца,—гэты дванаццацітомнік яшчэ ня ёсьць поўны збор твораў, а толькі збор самых выдатных, самых патрэбных у нашым жыцьці, у нашым будаўніцтве. Мы ўзялі за „образчык" чатырохтомнік Расійскага выданьня «Московского Рабочего». Да гэтага чатырохтомніка паступова мы дадавалі тыя з твораў Леніна, якія нам ва ўмовах Беларусі былі вельмі патрэбны. Мы, напрыклад, дабавілі там такія матар'ялы, як матар'ял па вывучэньню народніцтва, па вывучэньню легальнага марксызму і эканамізму, аграрнага пытаньня, нацыянальнага пытаньня, і ясна, што мы ўжо ў чатырохтомнік уклясьціся ня можам. Мы зараз укладваемся ў дванаццацітомнік, які ахоплівае ўсё тое, што нам патрэбна ў першую чаргу.

Далейшая наша думка—гэты збор твораў, калі ўжо выйдуць 12 тамоў, зрабіць поўным зборам, каб гэтыя далейшыя томы маглі ўмясьціць усе творы Леніна. Такім чынам, гэты збор твораў Леніна — дванаццацітомнік — ёсьць толькі частка поўнага збору твораў Леніна, які паступова будзе выходзіць.

Зараз ужо набраны два томы, якія хутка выйдуць. Затрымка тут з-за якіх-небудзь 30-40 слоў і зваротаў, скажам, маецца слова і ёсьць яго пераклад у беларускай мове, але рэдакцыя лічыць, што можа быць гэта яшчэ не падыйдзе. Такім чынам, два томы ў нас ужо гатовы. Далей—тры томы ў нас ужо зусім падрыхтаваны да друку і таксама хутка будуць набіравацца. Чатыры томы адрэдагаваны, ці-б сказаў, ня зусім яшчэ. Што датычыцца да ўсіх астатніх тамоў, то частка з іх ужо перакладзена, частка яшчэ не.

Так стаіць у даны момант наша праца. Будуць выходзіць томы не па парадку. Выпускаем першым томам трэці том твораў Леніна.

Вы запытаецеся, чаму мы ня можам пусьціць гэтых томаў папарадку? Ня можам пусьціць, таму, што мы зьвязаны тут агульным дасьледваньнем твораў Леніна, якое вядзецца ў іншых інстытуцыях. Як толькі які-небудзь том дасьледуецца ў іншых інстытуцыях, дык мы, ясна, гэтыя досьледы павінны выкарыстаць, калі ў нас у саміх яшчэ няма сіл, каб нам самім стварыць дасьледчую ленінскую інстытуцыю. Таксама нам трэба сачыць за другім выданьнем твораў Леніна ў расейскай мове. Мы, такім чынам, стараемся ўжо выдаваць нашыя томы, карыстаючыся другім выданьнем, якое зараз выдаецца ў расійскай мове. Вось чаму ў нас томы будуць ісьці не па парадку. І ад гэтага ясна палепшыцца якасьць гэтых тамоў і навуковая праверанасьць іх, бо мы тут будзем скарыстоўваць тыя працы, якія вядуцца іншымі інстытуцыямі.

Не скажу, каб мы вельмі адсталі ад іншых нашых суседзяў. Мы, напрыклад, ведаем, што таксама і на украінскай мове, як і ў нас, у друку зараз знаходзіцца два томы. Можа быць Украіна на месяц нас папярэдзіць, а можа быць нават выйдуць адначасна з нашымі двума томамі. На нямецкай мове ў даны момант выйшла паўтара тамоў—13 том і палова 20-га тому. У іх таксама падрыхтаваных да друку маецца некалькі тамоў. На ангельскай мове выйшаў пакуль толькі адзін том—13 том твораў Леніна. На францускай мове выйшаў толькі адзін том—XX.

Як бачыце, мы ўжо ня так адсталі ад іншых народаў у выданьні твораў Леніна на беларускай мове.

Недахопы ў працы.

Галоўны недахоп гэта тое, што мы маем мала сіл, што яшчэ і ў мове ў нас ня ўсё дасьледвана. Гэта ўсё адбіваецца на выданьні твораў Леніна. Тым ня менш, я лічу, што мы з сваімі заданьнямі спраўляемся, спраўляемся таму, што на гэта мы зьвярнулі вельмі вялікую ўвагу.

Пераходжу цяпер да чыста падворнага боку выданьня. Тут у прасьпэкце сказана, што ў сярэднім кожны том будзе мець 25-30 аркушаў; гэта ня зусім верна: там будзе ў сярэднім 30 аркушаў, нават больш за 30. Калі мы зрабілі калькуляцыю, то вылічылі, што нам том будзе каштаваць прыблізна 2 р. в капейкамі. Мы-ж пускаем яго ў продаж па рублю. Значыць, мы затрачваем спэцыяльныя сумы, каб творы Леніна пашырыць як мага больш. Мы тут ня хочам ставіць ніякіх камэрцыйных мэтаў. Гэта зразумела для кожнага з нас. Але гэта накладае на нас вялікі абавязак—як мага больш пашырыць творы Леніна ў масах. Вось чаму гэтае пытаньне і ўхвалена было паставіць на пасьлядзяньне Сэсіі, бо ясна, што пастаноўка гэтага пытаньня на Сэсіі прыцягвае да працы камісіі праз членаў ЦВК вельмі шырокія масы тых, хто паслаў сюды членаў ЦВК на працу.

І мы, таварышы, спадзяёмся і просім вас, каб вы ў гэтай працы пашырэньня твораў Леніна прынялі па магчымасьці самы гарачы ўдзел, бо пашырэньне твораў Леніна на беларускай мове вельмі і вельмі патрэбна для нашай культуры, для інтарэсаў нашай культурнай рэвалюцыі.

Выступленьне т. Хацкевіча па дакладу т. Ігнатоўскага.

Толькі што прынятая пастанова III Сэсіі ЦВК па дакладу аб выданьні і распаўсюджаньні твораў У. І. Леніна на беларускай мове абавязвае Прэзыдыум ЦВК ужыць усе захады, каб гэтыя творы былі найхутчэй выдадзены і найшырэй распаўсюджаны сярод працоўных мас Беларусі.

Мы ведаем, што на творах Леніна мільёны пралетарыяў, мільёны працоўных мас усяго сьвету навучаюцца барацьбе і перамогам над капіталізмам—за сацыялізм. Творы Леніна ў поўным выданьні, а таксама ў выглядзе паасобных кніжак-брашурак, распаўсюджваюцца па ўсяму сьвету на мовах розных нацыянальнасьцей.

У нашым сацыялістычным будаўніцтве мы ідём па шляху, паказаным У. І. Лінінным, не адхіляючыся у бок ні на адзін крок, што дало нам магчымасьць дасягнуць у нашым будаўніцтве вялізарных вынікаў і посьпехаў.

Калі паасобныя нашы дзеячы, у той ці іншы час упадалі ў памылку, то яны пакіроўваліся ўправа альбо ўлева ад ленінізму, каб потым пазнаўшы свае памылкі, ізноў вярнуцца назад і стаць на цьвёрды грунт ленінізму, альбо—яшчэ больш блытаючыся ў сваіх памылках і паступова адыходзячы ад сацыялістычнай рэвалюцыі,—стаць у варожы нам лягер.

У нашай барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва гэткія выпадкі будуць здарацца да нашай поўнай перамогі ў барацьбе за сацыялізм.

І таму нам усім, сябрам ЦВК, каб в посьпехам працаваць, каб безпамылкова кіраваць працай другіх, каб актыўна ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве і ўцягваць у гэтае будаўніцтва працоўныя масы Беларусі, трэба дасканала ведаць тую гэніяльную навуку якую пакінуў нам у сваіх творах Уладзімір Ільліч Ленін. Трэба веды ад гэтай навуцы даць усім рабочым і сялянам Беларусі на іх роднай мове.

Прэзыдыум ЦВК у поўным сваім складзе падпісаўся сёньня на творы Леніна па беларускай мове.

Трэба, каб члены ЦВК ня толькі падпісаліся па выданьне твораў Леніна на беларускай мове, але каб яны ўжылі ўсе захады да найлепшага распаўсюджваньня гэтых твораў сярод рабочых і сялян, сярод тых мас, дзе яны жывуць і працуюць.

Можна быць упэўненым, што Прэзыдыум ЦВК БССР, аажыцьцяўляючы пастанову 3-й сэсіі аб распаўсюджваньні твораў У. І. Леніна на беларускай мове, у гэтай сваей адказнай і пачэснай працы будзе мець поўнае патрыманьне з боку ўсіх працоўных мас рабочых і сялян Беларусі.

Няхай жывуць і пашыраюцца няўміручыя творы У. І. Леніна.

Зьмены ў законадаўстве БССР.

ДАКЛАД тав. ХАЦКЕВІЧА НА III СЭСІІ ЦВК БССР.

Перш за ўсё, таварышы, адносна тых некаторых зьмен, якія адбыліся ў складзе ўрадавых органаў за час ад другой да трэцяй Сэсіі ЦВК.

Народны Камісар Юстыцыі і Пракурор Рэспублікі тав. Сэгаль у свой час падаў заяву ў Прэзыдыум ЦВК з просьбай, каб яго аслабанілі ад абавязкаў Народнага Камісара Юстыцыі і Пракурора Рэспублікі з прычыны пераезду яго, па асабоваму жаданьню, для адказнай працы ў РСФСР. Гэтая просьба т. Сэгаля Прэзыдыумам ЦВК была задаволена. Пасьля аслабаненьня т. Сэгаля Прэзыдыум ЦВК назначыў Народным Камісарам Юстыцыі і Пракурорам Рэспублікі т. Сташэўскага і ў зьвязку з гэтым аслабаніў т. Сташэўскага ад абавязкаў Народнага Камісара Ўнутраных Спраў. Таксама Прэзыдыум ЦВК назначыў Членам Бюджэтнай Камісіі—члена ЦВК—Старшыню Віцебскага Акрвыканкому т. Валодзьку. Гэтыя пастановы ўносяцца на зацьверджаньне Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Далей, нам трэба разглядзець і зацьвердзіць 47 пастаноў (пералік якіх маецца ў вас на руках), прынятых Прэзыдыумам ЦВК і СНК паміж II і III Сэсіямі ЦВК. Усе гэтыя пастановы былі прыняты на падставе агульных дырэктыў Ураду СССР, на падставе пастаноў II-й Сэсіі ЦВК, а таксама на падставе запатрабаваньняў жыцьця. Сярод прынятых Прэзыдыумам ЦВК і СНК законаў ёсьць шэраг пастаноў аб зьменах паасобных артыкулаў Крымінальнага Кодэксу. Гэтыя зьмены і дапаўненьні паслужылі падставай для складаньня новага праэкту Крымінальнага Кодэксу, які мы разглядзелі і зацьвердзілі на гэтай Сэсіі ЦВК. Таксама зроблена пастановамі ўраду некольки зьмен і дапаўненьняў у Грамадзянскім Кодэксе ў бок лепшага захаваньня інтарэсаў дзяржаўных органаў, рабочае клясы і сялянскай беднаты.

Прынятыя за гэты час палажэньні аб Наркамземе, Наркамаховы Здароўя, ЦСУ і аб іншых цэнтральных органах, грунтуюцца на дырэктывах, якія былі дадзены II-й Сэсіяй ЦВК па дакладу т. Калініна аб рацыяналізацыі і спрашчэньні савецкага апарату, аб перадачы шэрагу функцый ніжэйшым органам.

Па ўсіх пастановах, якія былі прыняты Прэзыдыумам ЦВК і СНК, мы ня маем хадайніцтваў да Сэсіі аб перагляе зе тых ці іншых пастаноў, мы ня маем таксама пратэстаў з боку саюзных органаў па тыя або іншыя пастановы.

Таму я лічу, што было-б немэтазгодным (тым больш, што своечасова ўсе гэтыя законы былі надрукаваны ў нашым афіцыйным органе ЦВК,—газэце «Савецкая Беларусь»)—зачытваць, альбо даваць падрабязныя тлумачэньні па ўсіх гэтых 47 пастановах.

Я застанаўлюся толькі на 2-х момантах гэтага пытаньня:

Першае—у 1924 годзе III Сэсіяй ЦВК VI-га скліканьня быў прынят закон аб стварэньні дысцыплінарных судоў. Галоўны Дысцыплінарны Суд быў утворан пры ЦВК, а акруговыя дысцыплінарныя суды—пры АВК. Гэтыя суды павінны былі разглядаць справы па розных дробных злачынствах савецкіх адказных працаўнікоў. Жыцьцё паказала, што стварэньне гэтых судоў для газгляду розных спраў аб дробных злачынствах адказных савецкіх працаўнікоў, побач з агульнымі народнымі судамі, зьяўляецца нематэзгодным. Савецкая Ўлада і Савецкая грамадзкасьць лічаць, што чым большая пасада, тым большая адказнасьць работніка-кіраўніка і таму большае павінна быць накладаема пакараньне на такіх адказных працаўнікоў за дапушчэньне з іх боку злачынстваў і злоўжываньняў.

Справы аб злачынствах савецкіх работнікаў павінны быць разгледжаны ў нашых народных і акруговых судох, як і справы ўсіх іншых грамадзян, якія не зьяўляюцца савецкімі служачымі. Па гэтых меркаваньнях пастановай Прэзыдыуму ЦВК гэтыя суды былі зьліквідаваны.

Адначасова прынята палажэньне аб дысцыплінарных пакараньнях, аб дысцыплінарных узысканьнях. Гэтым палажэньнем кіраўнікам савецкіх устаноў дадзены правы накладваць дысцыплінарныя ўзысканьні на пяднарадкаванных ім служачых напрыклад, за неакуратнае выкананьне абавязкаў, за неакуратную яўку на службу і г. д. і г. д.

Другі момант, аб якім я лічу патрэбным давесьці да ведама Сэсіі ЦВК—гэта тое, што ў гэтым годзе ня так даўно Прэзыдыум ЦВК праз свой апарат зрабіў праверку выкананьня дырэктыў і пастаноў VIII Ўсебеларускага Зьезду Саветаў нашымі цэнтральнымі ўрадавымі органамі. Гэтая праверка паказала, што як наркаматамі, так і іншымі цэнтральнымі ўстановамі ўсе тыя пастановы і дырэктывы, якія былі даны VIII Усебеларускім Зьездам Саветаў, выконваюцца правільна і своечасова.

Разам з гэтым Прэзыдыум ЦВК даручыў наркаматам і цэнтральным установам распрацаваць канкрэтны плян выкананьня перспэктыўных дырэктыў па розных пытаньнях нашага будаўніцтва, па якіх Зьезд Саветаў прадугледзеў перспэктывы на некалькі год.

Адносна ўсіх іншых пастаноў Прэзыдыуму ЦВК і СНК, прынятых паміж сэсіямі, я прапаную гэтыя пастановы і законы зацьвердзіць, тым больш, што яны ўсе ўжо ўведзены ў жыцьцё, пры поўным адсутнічаньні пратэстаў.

ЦЭНТРАЛЬНАМУ ВЫКАНАЎЧАМУ КАМІТЭТУ БССР.

Сабраўшыся на свой першы Ўсерасейскі Зьезд, працаўнікі асьветы-беларусы РСФСР, сыстэматычна выкарыстоўваючыя ў сваёй штодзённай працы вопыт, дапамогу і дасягненьні БССР па пытаньнях асьветы беларускіх працоўных мас, пасылаюць у дзень падрахаваньня вынікаў працы і намечаньня далейшых перспэктыў братэрскае прывітаньне Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту БССР.

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Шчаціншчыкі абмяркоўваюць пяцігодку.

ГОМЕЛЬ, 28-9. Шчаціншчыкі абмеркавалі пяцігадовы плян шчаціннае вытворчасьці. Пытаньне гэтае хвалюе ня толькі гомельскіх шчаціншчыкаў, але і шчаціншчыкаў усяе Беларусі. Згодна пляну, апрацоўка сыравіны да канца пяцігодзьдзя ня будзе скарочана. Штогод ва ўсіх шчаціннных фабрыках БССР будзе апрацоўвацца 39 тысяч пудоў шчаціны. Вытворчасьць мэханізуецца. Закупляецца на 70 тысяч руб. машын. Лік рабочых будзе скарочан з 450 да 291. Частка рабочых будзе перакінута на шчотачную вытворчасьць, якая мае ў нас вялікія перспэктывы.

На нарадзе выявілася, што пяцігадовы плян мае шмат недахопаў. Так, для віцебскіх шчаціннікаў мяркуецца пабудаваць шмат кватэр, а для гомельскіх—мала. Для менскае фабрыкі патрачана 26 тысяч руб. на вэнтыляцыю, для гомельскае—дробязь. Трэст забыўся аб падрыхтоўцы зьмены для кваліфікаванае рабсілы. Рабочыя падалі прапанову аб канцэнтрацыі шчаціннае прамысловасьці. Для канцэнтрацыі адпавядае гомельская фабрыка. Тут прыдзецца выдаць толькі да 60 тысяч руб. на пабудолу будынку, у той час, калі па пляну прадугледжаны выдатак 150 тысяч.

Сяўба праходзіць дрэнна.

(Уваравіцкі райён, Гомельшчына).

Асеньняя сяўба па нашаму райёну праходзіць вусім дрэнна. Сяляне чакалі, чакалі машын для ачысткі жыта, а іх як і на сьвеце няма. Нашаму Чабатоўскаму сельсавету з РВК было дадзена ўказаньне аб ачыстцы жыта да 10 верасьня г. г., а сельсавет зусім гэтага не зрабіў. Сяляне, якія чакалі машын, пачалі сеяць неачышчаным жытам. Пракатныя пункты, а таксама і рэдзітныя таварыствы за гэты час нічога не зрабілі. У таварыствах няма сартавога жыта, няма пшаніцы-зімоўкі, няма вікі зімовай і інш. Аграномы нічога не зрабілі па растлумачэньню сялянам карысьці сартаванага жыта.

Сялянства нагалоўна сее сорным жытам.

Хто вінаваты ў гэтым?

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ТЫРАЖУ ПАЗЫКІ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

ГОМЕЛЬ, 29-IX. Акрфінаддзел пачаў падрыхтоўку правядзеньня тыражу 48 сэрыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі. Утвараецца спэцыяльная тыражная камісія ў складзе прадстаўнікоў Наркамфіну СССР, Наркамфіну БССР, Акрвыканкому, Акрфінаддзелу, Прафсаюзаў, рэдакцыі «Палескай Праўды», РСІ, банкаўскіх устаноў, 10 сялян трымальцаў аблігацый пазыкі і г. д.

Делегаты сялян будуць абірацца на агульных сходах, прычым делегатаў у тыражную камісію будуць абіраць тыя сельшчы, у якіх рэалізацыя пазыкі прайшла здавальняюча.

Для правядзеньня тыражу намячаецца скарыстаць памяшканьне цырку. Будуць арганізаваны экскурсіі членаў саюзу для азнаямленьня з тыражом. Табліцы выйгрышаў у той-жа дзень будуць публікавацца ў «Палескай Праўдзе».

У мэтах прадастаўленьня магчымасьці сялянам атрымаць па выйгрышу замест грошай сельска-гаспадарчыя машыны, Акрфінаддзел пачаў перагаворы з Палессельсаюзам аб замацаваньні пэўнага фонду сельска-гаспадарчых машын.

ЯК ВЫКОНВАЮЦЦА ДАГАВОРЫ ПА АХОВЕ ПРАЦЫ.

Інспэкцыя працы ў хуткім часе скончыць праверку выкананьня дагавораў па ахове працы. Па падпісаных дагаворах гаспадарнікі павінны былі сёлета на мерапрыёмствы па ахове працы асыгнаваць: у Палесдруку—4 тысячы руб., электрастанцыі—6.500 р., лесазаводзе «Колтруд»—4.200 руб., лесазаводзе «Сацыялізм»—1.100 р., заводзе «Красный Химик»—3.500 р., «Двигатель Революции»—8.000 руб., гарбарні «Пралетарский Путь»—3.000 руб., на фабрыцы «Герой Труда» у Добрушы—15.000 руб. на заводзе «Красноцвет» у Лоеве—1.125 руб., на заводзе «Пролетарий»—21.500 р.

У Рэчыцы на фабрыцы «Днепр» усе дробныя мерапрыёмствы па ахове працы выкананы, а ў адносінах да буйных, выкананьне адкладзена да канчатковага вырашэньня пытаньня аб далейшай працы старой фабрыкі «Днепр». Калі фабрыка ў новым апэрацыйным годзе будзе працаваць, дык на мерапрыёмствы па ахове працы будзе выдадзена каля 15 тысяч руб. На фабрыцы намячалася зрабіць шафы для захаваньня вопраткі, рукамыйнікі водаправоднага тыпу і г. д.

Новае ў абслугоўваньні рабочых.

Магілеў, 29-9. Тэатральны сэзон адкрываецца 2 кастрычніка п'есай «Разлом».

Будынак тэатру да адкрыцьця сэзону капітальна адрамантаваны, зроблена прыстройка, круцячаяся сцэна і г. д., на што выдаткавана звыш 30 тысяч рублёў.

Зроблен далейшы крок да набліжэньня тэатру да рабочага гледача. Акрамя звычайнай рабочай паласы, уводзяцца яшчэ сэзонныя білеты, якімі рабочыя і служачыя данага калектыву могуць карыстацца па чарзе. Білеты для рабочых са скідкаю і ў крэдыт.

Рэпэртуар намечан з лепшых п'ес. Мяркуецца, што кожная п'еса будзе ісьці цэлы тыдзень,—гэта з аднаго боку дасьць магчымасьць лепш падрыхтоўваць пастаноўкі, в другога—шырэй абслужыць рабочую масу тэатран. У праграме тэатральнае працы—дыспуты, сходы гледачоў.

Сэзон пачынае расейская драматычная трупа, галоўны рэжысэр—У. У. Кумельскі, якога магілёўцы добра памятаюць па працы яго ў сэзон 1921-1922 году. Расейская трупа будзе працаваць да канца студзеня.

З 1 лютага,—пастаноўкі Другога Дзяржаўн. Беларускага Тэатру.

Вячэрнія школы для рабоча-сялянскай моладзі.

БАРЫСАЎ, 29-IX. Барысаўскі васковы райком камсамолу адчыняе ў бягучым навучальным годзе 4 вячэрнія школы для рабоча-сялянскай моладзі, замест 2 школ у мінулым годзе. Апрача гэтага, кожная ячэйка камсамолу арганізуе лікпункт па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод сялянскай моладзі. Гэтымі лікпунктамі будзе ахоплена больш 250 чал.

НА БАРАЦЬБУ ЗА УРАДЖАЙ!

Сярод шэрагу адказных і складаных задач у сацыялістычным будаўніцтве сельскае гаспадаркі БССР у сучасны і бліжэйшы перыяд зьяўляецца неабходным асабліва выдзеліць на адным з першых месц задачу павялічэньня ўраджайнасьці ў масавай сялянскай гаспадарцы БССР. Па сутнасьці гэта задача зусім не зьяўляецца пытаньнем толькі сёпешняга дня: яна мелася, як практычная мэта, у сыстэме сельска-гаспадарчых мерапрыёмстваў і ў папярэднія гады—напрыклад, асабліва ў працы па забясьпечаньню насельніцтва палепшанымі сродкамі вытворчасьці, увядзеньню пасеваў лубіну на ўгнаеньне, арганізацыі зернаачышчэньня, шматпалёвых севазваротаў і г. д. Але-ж асаблівае значэньне павінна быць задача падвышэньня ўраджайнасьці іменна ў сучасны і бліжэйшы перыяд сельска-гаспадарчага будаўніцтва. І вось чаму.

Апошнія 5-6 гадоў сельская гаспадарка БССР паступова, але досыць выразна пасоўвалася наперад у сэнсе дасягненьня і пераходу так званага даваеннага ўзроўню ў адносінах колькаснага павялічэньня агульнай пасеўнай плошчы і жывёлы. Гэта быў у асноўным перыяд выхаду з становішча заняпаду сельскай гаспадаркі, як вынік даваенных гадоў. Адначасова вызначаліся таксама адзнакі паступовай перабудовы асобных галін масавай сельскай гаспадаркі БССР у напрамку іх рацыналізацыі—гэта значыць, у напрамку большай адпаведнасьці ўмовам і запатрабаваньням разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР наогул. Напрыклад, можна прывесьці наступныя лічбы, якія адбіваюць якасны боч зьмен у галявой гаспадарцы ў напрамку гэтай рацыналізацыі:

ГОДЫ	Суадносіны асноўных груп палявых культур у складзе пасеўнай плошчы ў процантах да пасеўной плошчы БССР.					УВАГА
	Зерневыя	Бульба	Лён і канапля.	Пасеўныя травы	Усяго	
1916 . . .	82,2	8,9	4,2	4,7	100	Даныя за 1928 г. узяты з лічбаў папярэдніх вынікаў весавога ачоту пасеўных плошч у сялянскіх гаспадарках БССР.
1924 . . .	81,5	11,3	3,5	3,7	100	
1925 . . .	79,2	12,1	4,6	4,1	100	
1926 . . .	77,9	12,9	4,6	4,6	100	
1927 . . .	76,7	13,2	5,0	5,1	100	
1928 . . .	74,9	13,0	5,3	6,8	100	

Адноснае памяншэньне ўдзельнай вагі зернавых культр і павялічэньне вагі бульбы, тэхнічных (лёну і канапелі), пасеўных траў адпавядае запатрабаваньням прагрэсыўнага разьвіцьця сельскае гаспадаркі. Адносна-ж узроўню ўраджайнасьці ў масавай сялянскай гаспадарцы лічбы кажуць зусім іншае: узровень ураджайнасьці апошніх гадоў нават не дасягнуў даваеннага узроўню, зусім нездавальняючага па сваёй вышыні сучасным запатрабаваньням як сельскай, так і ўсёй народнай гаспадаркі БССР у цэлым. Вось гэтыя лічбы аб узроўні сялянскіх ураджаяў у цэлым па БССР:

Годы.	У пудах на дзесяціну.							Увага.
	Жыта азім.	Ячмень.	Авёс.	Бульба.	Грэчка.	Лён. Насеньня.	Лён. Валакна.	
1905—15 (у сярэднім)	45,7	50,3	51,7	554,4	31,5	23,8	25,1	Данныя аб ураджаю 1928 г. узяты па папярэдніх ацэнках ураджаю Цэнтральнай Экспэртнай Камісіяй на 1-га верасьня.
1924 . .	46,1	48,9	55,0	547,2	32,4	25,4	23,6	
1925 . .	46,8	50,8	51,6	561,1	27,8	21,5	20,8	
1926 . .	38,8	44,7	39,2	536,2	28,0	17,2	15,7	
1927 . .	41,4	40,4	34,9	534,5	25,5	15,8	19,8	
1928 . .	44,0	45,0	46,0	519,0	28,0	18,0		

Гэтымі лічбамі без асобных тлумачэньняў падкрэсьліваецца неабходнасьць і пернапачарговасьць вырашэньня пытаньня аб падвышэньні ўраджайнасьці ў сялянскіх гаспадарках БССР; бяз гэтага зусім выразна складаецца пагроза разьвіцьцю станоўчых бакоў у сельскай гаспадарцы, у прыватнасьці павялічэньню таварнасьці яе, вытворчасьні працы сялянства.

Зараз Наркамземам арганізуецца шырокае абгаварэньне праз друк, на асобных нарадах спэцыялістаў і зямельных працаўнікоў сялянскіх сходах пытаньня аб шляхох і мерапрыёмствах, забясьпечваючых сыстэматычнае павялічэньне ўраджайнасьці ў сельскай гаспадарцы БССР. Каштоўнасьць гэтага абгаварэньня будзе залежаць у асноўным, папершае—ад таго, наколькі шырока ў гэта абгаварэньне будуць уцягнуты шырокія колы сялянскай грамадзкасьці, сялянскага актыву, спэцыялістаў сельскай гаспадаркі, асабліва працуючых непасрэдна ў вёсцы, а таксама ўсіх працаўнікоў, зьвязаных ў тай ці іншай ступені з задачамі арганізацыі сельскае гаспадаркі, і падругое—паскольки ў выніку гэтага абгаварэньня будуць высьветлены шляхі і формы найбольш практычных мерапрыёмстваў па павялічэньню ўраджайнасьці пры сучасным становішчы сельскай і ўсёй народнай гаспадаркі БССР. Высьвятленьне найбольш практычных мерапрыёмстваў у справе падвышэньня ўраджайнасьці ў значнай ступені залежыць ад таго, як будзе ставіцца само пытаньне аб ураджайнасьці пры абгаварэньні.

Бязумоўна, узровень ураджайнасьці залежыць ад шэрагу умоў (фактараў), якія у асноўным можна падзяліць на наступныя групы: а) прыродныя (клімат, глеба) б) эканамічныя (рынкавыя ўмовы, тып гаспадаркі); в) тэхнічныя (узровень тэхнікі с.-гасп. г) мерапрыёмства сельска-гаспадарчай і агульнай эканамічнай палітыкі. Наогул кажучы, правідловай будзе пастаноўка пытаньня аб шляхох падвышэньня ўраджайнасьці, пры якой будзе ўлічвацца ўплыў усіх фактараў кожнай з вызначаных груп. Вузкая пастаноўка пытаньня, напрыклад, тлумачэньне нізкіх ураджаяў у сялянскіх гаспадарках БССР толькі беднасьцю беларускіх глеб, недахопу ўгнаеньняў, ці адсталасьцю ў тэхніцы вядзеньня сельскай гаспадаркі, будзе зьяўляцца некаштоўнай, памылковай. Улічваючы зьвязанасьць узроўню ўраджайнасьці гаспадарак з цэлым шэрагам фактараў, адначасова мы лічым ня зусім каштоўнай у практычных мэтах пастаноўку пытаньня аб ураджайнасьці ў падзеле на столькі шырокім, пры якім фактычна праблема (задача) ураджайнасьці замяняецца задачай разьвіцьця вытворчасьці ўсёй сельскай гаспадаркі. Бясспрэчна, што, напрыклад, павялічэньне росту гарадоў, гарадзкога прамысловага насельніцтва, зьвязанае з пашырэньнем рынкаў збыту для вытворчасьці сельскай гаспадаркі, мае ўплыў на ўздым сельскай гаспадаркі, у тым ліку і на падвышэньне ўраджайнасьці, але зусім небясспрэчным з пункту погляду практычнай пастаноўкі пытаньня аб ураджайнасьці высоўваньне задачы павялічэньня росту гарадоў (так званая ўрбанізацыя краіны) на адным з першых месц у сыстэме мерапрыёмстваў па падвышэньню ўраджайнасьці.

Нядаўна ў Менску адбылася нарада спэцыялістаў сельскай гаспадаркі, на якой абгаварвалася пытаньне аб павялічэньні ўраджайнасьці ў сельскай гаспадарцы БССР. У выніку гэтага абгаварэньня можна скласьці досыць вялікі сьпіс мерапрыёмстваў, якія пры сваім ажыцьцяўленьні могуць забясьпечыць падвышэньне ўраджайнасьці ў сельскай гаспадарцы і, наогул, вытворчасьці яе. У гэты сьпіс ува

Падрыхтоўка да перавыбараў саветаў.

Кампанія падрыхтоўкі да перавыбараў саветаў у БССР распачата своечасова. Яшчэ ў чэрвені г. г. прэзыдыум ЦВК БССР разаслаў усім АВК абежнік аб падрыхтоўцы да перавыбараў саветаў.

Цэнтральная Выбарчая Камісія ЦВК БССР нядаўна разаслала акругам брашуру «Да перавыбараў саветаў», у якую сабраны ўсе матар'ялы, інструкцыі, якія датычаць перавыбараў.

Акругі таксама дзейна рыхтуюцца да перавыбараў. У Аршанскай акрузе арганізацыйна-падрыхтоўчая тэхнічная праца па правядзеньні кампаніі перавыбараў саветаў распачалася фактычна з 31-га ліпеня, у Мазырскай акрузе—з 27-га ліпеня, у Менскай акрузе да 27-га верасьня праведзена ўся падрыхтоўчая работа. Водпуг паведамленьняў цэлага шэрагу округ, на мясцох ужо ўтвораны выбарчыя камісіі і выбарчыя вучасткі пачынаюць рыхтавацца да справаздачнасьці, праводзіцца праверка выкананьня наказаў выбаршчыкаў. У Аршанскай акрузе выслан спэцыяльны інструктар, які будзе праводзіць праверку на мясцох падрыхтоўкі да перавыбараў. Апроч гэтага, распачата праца па перагляду сьпісаў выбаршчыкаў, пазбаўленых выбарчых правоў.

Дзеля таго, каб шырока ўцягнуць у кампанію перавыбараў саветаў жаночую частку насельніцтва, скончыўшыя курсы ЦВК і жаночы актыў на мясцох распачынае адпаведную працу сярод жанчын.

Камітэты ўзаемадапамогі рыхтуюцца.

ЦК сялянскіх к-таў узаемадапамогі разаслаў на месцы дырэктыву аб належным удзеле к-таў узаемадапамогі ў перавыбарах саветаў. Зварочваецца ўвага на ўцягненьне ў кампанію батракоў-беднякоў і серадняцкіх мас, прымаюць актыўны ўдзел у падборы адпаведных кандыдатур у склад саветаў, трэба высоўваць кандыдатаў з складу сяброў к-таў, батракоў-беднякоў і лепшых сераднякоў, якія карыстаюцца давер'ем мас. Вялікая ўвага павінна быць зьвернута на поўны ўдзел у перавыбарах жанчын-сялянак, галоўным чынам, батрачак, бяднячак і сераднячак.

Дзеля таго, каб дабіцца ізаляцыі заможнай часткі вёскі на перавыбарах саветаў, трэба праводзіць арганізаванае і актыўнае выступленьне беднаты і батрацтва.

С-г. школа дарослых сялян.

(Барысаўскі раён).

У вёсцы Лошніцы з пачатку 1927-28 навучальнага году распачала сваю працу рухомая сельска-гаспадарчая школа дарослых сялян. У школу прымаліся сяляне, якія былі зацікаўлены у набыцьці сельска-гаспадарчых ведаў. Школу наведвала 50 вучняў сялян, якія самастойна вялі сваю гаспадарку. Але гэтаю лічбаю вучняў абмежавацца было нельга, асабліва ў сьвяточныя дні. Заняткі вяліся штодзённа ад 6-ай да 10-ай гадзіны вечара; гэта давала магчымасьць сялянам, не адрываючыся ад працы ў гаспадарцы, наведваць школу. Тэарэтычныя заняткі вяліся 5 з паловай месяцаў. Увесь гэты час вучні знаёміліся з агракультурнымі мэтадамі палепшаньня с.-г. Пасьля апроснага калёквіуму 31 чалавек выявілі здавальняючыя веды, аб чым дадзены належныя пасьведчаньні.

Школа абслугоўваецца двума настаўнікамі-агранамамі, пад непасрэдным кіраўніцтвам якіх вучні набываюць тэарэтычныя веды па сельскай гаспадарцы, а таксама ажыцьцяўляюць іх на практыцы.

Правядзеньню агракультурных ведаў сярод вучняў і акаляючага насельніцтва дапамагаюць розныя с.-г. машыны і прылады, як-та: радковая сеялка, пружынная барана, акучнік, сэпаратар, маслабойка, апрысківаць, планет і іншыя садова-гародныя прылады, якія маюцца пры школе.

Сяляне-слухачы карыстаюць набытыя веды ў сваіх гаспадарках. Так, за бягучы год яны правялі такую працу: абрэзку і пабелку садоў, пасадзілі гародныя расьліны, як капусту, кораньплоды—у радкі, а ня ў грады, як рабілася да гэтага часу, увялі раньнія і занятыя папары, пачалі заворваць раней ржышча, набываюць розныя мінэральныя ўгнаеньні, скарыстоўваюць попел і торф як угнаеньне. Шмат слухачоў уцяплілі і асьвятлілі хлявы і парабілі дацкія кармушкі і ў далейшым імкнуцца перайсьці на харчаваньне скаціны па нормах. Гэтаму надта спрыяе зробленае паказальнае харчаваньне 5-ці сялянскіх кароў. Дзякуючы актывістам-слухачом вёска перайшла на шматпалёвы севазварот, значна пашырыўшы пасеў кармовых траў: вікі, канюшыны, сэрадэлі і інш. Сяляне-вучні сыстэматычна пераганяюць малако на сэпаратары, а гэта складае ўмовы дзеля арганізацыі малочнага таварыства.

Школа за караткі час, зразумела, не змагла канчаткова зьнішчыць традыцыйныя спосабы вядзеньня гаспадаркі, але ў значнай меры ліквідавала агранамічную і палітычную няпісьменнасьць. Дзеля паглыбленьня і замацаваньня праробленай школай працы пажадана, каб у наступны навучальны год школа распачала сваю працу недалёка ад старага месца.

Настаўнік В. С.

Перад і пасьля сяўбы.

(З блекноту падарожніка).

Копысь—адзін з заштатных гарадоў Беларусі. Так кажуць усе. Я думаю, што гэта ня так: Копысь—звычайнае раменьніцкае мястэчка. Толькі рабочыя з кафельных заводаў ажыўляюць мястэчка. Зрабеце паўтара кілёмэтры ад станцыі—і вы ў „цэнтры" гораду. «Цэнтр» адрозьніваецца ад «акраін» паламанымі тратуарамі з дошчак ды шыльдамі раённых установаў.

У Земадзеле Райвыканкому паведамілі, што сёлета ўпаршыню ў Копыскім раёне зварочваецца ўвага на садоўніцтва. На іх пляну меркавалася арганізаваць групавыя сады на плошчы 60 гэктараў. На гэту справу трэба было атрацiць 12 тысяч рублёў. Але спакойныя людзі Аршанскага акрэмаддзелу адпусьцілі ўсяго 2000 руб., у выніку чаго, замест памеркаваных 60 гэктараў, будзе засаджана ўсяго 10. Сады будуць закладзены выключна ў новаарганізаваных калектыўных гаспадарках.

Як вялікае дасягненьне, чым копыскія таварышы маюць права ганарыцца, гэта—арганізацыя да пасеўнай кампаніі 7 новых калектыўных гаспадарак, з якіх 3 калектывы арганізаваны з працоўнага яўрэйскага насельніцтва. З гэтай колькасьці тры калектывы ўжо землеўпарадкаваны і правялі засеў пановаму, а астатнія чатыры, за адсуткасьцю каморнікаў, будуць землеўпарадкаваны вясной 1929 году з такім разьлікам, каб вясеньняя сяўба была зроблена на землях калектываў.

У часе правядзеньня вясеньняй пасеўной кампаніі па райёну было арганізавана 10 калектыўных гаспадарак, якія ўжо канчаткова аформлены і землеўпарадкаваны. Зараз райённая арганізацыя перавяла іх па шматпольны севазварот. Кожнаму калектыву выдадзена па паўтары тысячы рублёў крэдыту. Вытворчыя пляны на 1928-29 г. калгасамі ўжо складзены. Першае ўражаньне кажа за тое, што сапраўды, як запэўнялі ў Акруговым Зямельным Аддзеле, пасеўная кампанія ў Копыскім раёне прайшла пасьпяхова, а селькораўскія допісы зьяўляцца хлусьнёй ня толькі на райённую але і на акруговую ўладу. Але калі паглядзіш глыбей, забярэшся ў гушчу сялянства, дык і ўражаньне будзе на баку селькораўскіх допісаў.

* * *

Цікава прывесьці гутарку сялян адносна пасеўкампаніі, якую я пачуў у агульным пакоі Копыскага Райвыканкому:

— Пытаеш як з угнаеньнем? Не кавары. Жывёлы мала—конь, карова, пара авечак. Гной ад іх на гарод вывезеш, дый то мала. Сёлета вясной меркаваў лубіну дастань—дорага, адзін пуд набыў для разводу. У крэдытку падаваў заяву, каб адпусьцілі штучнага ўгнаеньня—„няма" кажуць. Бяда з імі. Прымлося сеяць на няўгноенай палосцы.

— Праўду кажаш, Лукаш,—падкажае яму другі селянін.—У нас у вёсцы таксама многія жадалі набыць штучнае ўгнаеньне.—Няма!—усюды ім адказваюць—будзе хутка. Вось гэта хутка... Прывязуць, калі сьнег ужо ляжа...

І запраўды, з угнаеньнем у райёне—караул крычы. Водпуг дакладных падлікаў, сялянства райёну патрабавала 37 тон тамасшлаку, 97 тон касьцяной мукі, 16 тон суперфасфату, 10 тон фасфарытнай мукі. Два крэдытныя таварыствы, якія маюцца ў райёне, за ўвесь час сяўбы прывезьлі толькі 2 вагоны суперфасфату. Ужо 20 жніўня на складах таварыстваў ня было ніводнага фунту гэтага ўгнаеньня.

Гэты факт паказвае, што сялянства, у сваёй большасьці, здало свае «кавэратыўныя пазіцыі»; гэта кажа за тое, што аграманія сваімі вопытнымі дзялянкамі з штучным угнаеньнем, раскіданымі па ўсяму райёну, змагла запэўніць селяніна ў карысьці штучнага ўгнаеньня, яно яго патрабуе, а ны ня можам задаволіць іх законнае патрабаваньне. Гэта наша вялікая і сур'ёзная памылка. Папраўляць яе позна. Мы можам толькі папярэджваць гаспадарчыя органы, каб гэтая памылка не паўтарылася ў часе правядзеньня вясеньняй пасеўной кампаніі 1929 году.

* * *

Для ачысткі насеньня ў райёне падрыхтавана восем насеннаачышчальных пунктаў з усімі машынамі ў іх. На дапамогу пацярпеўшым ад градабіцьця ў райён павінна быць завезена дзьве тысячы пудоў сартавога насеньня. Праз арцелі будзе абменена сялянам 700 пудоў сартавога насеньня.

Словы, словы... Гэта можна было пачуць на любым пасяджэньні РВК, сельсавету, агульна-сялянскім сходзе. А на справе? Ва ўсім райёне маюцца два машынныя таварыствы, якія поўнасьцю не забясьпечаны неабходнымі машынамі. У калгасах, арцелях, таварыствах няма ніводнай радавой сеялкі. А НК Земляробства Беларусі даў распараджэньне ўсім калгасам, каб сёлета пасеў правесьці выключна радавымі сеялкамі. Адно рабіць распараджэньні, другое, выконваць іх. Вінаваты ў гэтым сам Народны Камісарыят Земляробства: загад быў падпісаны, а калгасы не забясьпечаны неабходнымі машынамі.

Цім. Зарэчны.

Праверка—самакрытыка—кантроль мас.

„Савдурань".

За адсутнасьцю ў БССР часопісі «Крокодил", якая праводзіць вялізарную працу па выяўленьні дурняў СССР усіх рангаў і ступеняў, „Савецкая Беларусь" бярэ на сябе абавязак дапамагчы жаранаму расейскаму сабрату ў яго працы і сьціпла высоўвае на конкурс і настойліва, да апошняе кроплі крыві, патрабуе прэміі для грамадзяніна

Д. Юдзенкова з г. Клімавічы.

Гэту сваю ганаровую годнасьць Юдзенкоў Д. заслужыў выпускам у сьвет колькасьці 1050 экз. манаграфій пад назвай:

«Мои предки».

Чытачу можа паказацца, што предкі гр. Юдзенкова варты манаграфіі побач з выдатнейшымі прадстаўнікамі чалавецтва, але... памыляцца чытач. Кніга Юдзенкова выходзіць у парадку Гоцкага Альманаху і нават напамінае апошні тым, што ў абодвых ідзе гутарка аб Бурбонах. У Гоцкім Альманаху—аб Бурбонах, у Юдзенкова—так сама, толькі з маленькай літары.

Аднак, па парадку. «Продкі» Юдзенкова ўклаліся ў 16 стар. Апісаньню цэлае купы зяцёў, бабак і дзяцей прадпаслана радаслоўная табліца і ўступ аўтара, у якім пішацца:

„Знать прошлое рода моего до самого начала жизни на земле—жажда неутолимая. Какая была та живая нить, от рода в род, которая дала мне благо великое—жизнь? Почему не оборвалась она под ураганом кровавых мировых событий от века? Любому смертному эту задачу не решить. Перед очами нашими огромная чернеющая даль, из которой вышли наши далекие предки. Окутанные мраком спереди и сзади живем мы".

Ну, вядома, шкода, што жыцьцё Д. Юдзенкова не абарвалася пад гуратанам крывавых падзей, а то вось цяпер яму беднаму прыходзіцца жыць, акутанаму «мракам спереди и сзади».

Ці так было, калі жылі «далёкія продкі" Юдзенкова (аб сабе мабыць як аб ня вельмі далёкім чалавеку, Юдзенкоў ужо сказаў).

...„пів водку, нрава был крутого и пылкого. Помещица Мартынова Шарлотта Иосифовна его ценила и уважала, обращаясь к нему, всегда говорила: „Сидор Яковлевич". Любил дед товарищей, песьни и водку. Говаривал часто: если меня спросят идти ли в ратья, то я скажу: иди сперва погложи осину, если сладкая—иди, горькая—не иди".

Разумны быў дзед, што і казаць, але і ён бы пачырванеў за ўнука, які з вучоным і засмучаным выглядам апавядае чалавецтву аб тым, што:

«Сохранилось устное предание, будто у прапрадеда Ивана Исаковича Трубеля на «островке», около речки Бесяды, под вязом была будка».

І далей:

„Точно установить причины, по которым дедушка попал в ратья к крестьянину села Березки Иуде Ивановичу Трубелю, нет возможности».

Сапраўды, становішча ў Юдзенкова жудаснае. Зьлітуйцеся, няма магчымасьці дакладна ўстанавіць прычыны, як дзед папаў у зяцьці. Сапраўды, „мрак спереди и сзади".

Затое дакладна ўстанавіў Юдзенкоў, што

„Около 1794 года женился сын Григория Филипповича, мой прадед, Яков Григорьевич на Дарье Захарьевне".

Вясёлая кніга. Прачытаўшы яе, мэлянхолікі з лягеру сацыял-згоднікаў і тыя страцяць духоўную роўнавагу. Кніга Юдзенкова—незаменны сродак ад перараджэньня шчыткоўае залозы, бо прымушае чалавека борчыцца ад прыступаў нястрымнага сьмеху.

Бацька аўтара, аб якім гаворыцца з пашанаю, што ён браў удзел у бойках пад камандаю генэрала Скобелева, часта бачыў самога цара Аляксандра II-га (стар. 13) пяраз казаў сыну:

— Праз дурную галаву—нагам неспакой.

Ён быў праў, гэты паважаны царскі служака, з вёскі Генэралаўкі.

Вырас Юдзенкоў Д. і апраўдаў бацькаўскую прыказку.

Яго кніжка ўся напісана «неспакойнымі нагамі».

І—«праз дурную галаву». Ар.

Так далей нельга.

Праведзенае абсьледаваньне паказала, што грамадзкае харчаваньне на Мазырчыне і па сучасны момант зьяўляецца нездавальняючым. Асаблівую ўвагу зьвяртае на сябе мазырская сталоўка ЦРК.

Тут і дрэнная смакавая якасьць абедаў і неабсталяванасьць, і антысанітарнае трыманьне памяшканьня, і адсутнічаньне кваліфікаваных працаўнікоў, і шмат іншых «і».

Не аднойчы пісалася ў газэтах пра трохстапнёвыя чаргі, пра мух у супе, і інш...

Прыймалася таксама нямала пастаноў, а справа ўсё ні з месца. Пералічаныя недахопы ня зьнішчаюцца, лік іх увесь час узрастае.

Так далей прадаўжацца ня можа. Як найхутчай Мазырскі ЦРК і іншыя зацікаўленыя ўстановы павінны прыняць усе меры да падтуканьня новага памяшканьня, да пашырэньня мазырскай сталоўкі.

Я. П.

Беднота патрабуе расьсьледваньня.

Ганнаполь-Крупіцкае спажывецкае таварыства (Менская адруга) лічыцца ў райёне адным з моцных. Старшыня праўленьня Гінтаўт—працаўнік «стары», сьвядомы, карыстаўся, да гэтага часу карыстаецца аўтарытэтам сярод заможнага сялянства. Сватоў, братоў і рознай радні за час сваёй працы старшыня нажыў досыць значны лік. Асабліва-ж уся гэта радня яскрава выявілася ў гэтым годзе з прычыны недастачы хлеба. У сувязі з тым, што сёлета хлеб пасьпеў значна пазьней, як летась, у многіх сялян не хапіла свайго хлеба да новага. З гэтай прычыны прыходзілася шукаць хлеба на старане. Ганнаполь-Крупіцкае-ж таварыства арандуе ад РСК млын, і як вядома, за памол збожжа бярэцца натурай, пагэтаму зьбіраецца ад памолу хлеб, які павінен раздавацца вясковай беднаце, рабочым крахмальнага заводу, саўгасу і служачым. Выдача на млыне хлеба рабілася мельнікамі па запісках старшыні.

Калі-ж беднота, нездаволеная выдачай хлеба, патрабавала ад сельсавету праверкі запісак, на якіх адпускаўся хлеб, выявілася, што хлеб адпускаўся «сваякам» і розным знаёмым—па 3-5 пуд. Напрыклад, свайму супрацоўніку Баркоўскаму было адпушчана за месяц 9 пуд., у той час, як беднота атрымлівала 10-20 фунтаў. Беднота ўзбурана ўчынкамі старшыні і патрабуе расьсьледваньня.

Райённы.

5 месяцаў шукаюць справу.

Гр-н. г. Барысава С. яшчэ ў 27 г. падаў заяву, у дадатак да якой прыклаў даведку аб сьмерці сына ў Чырвонай арміі, каб выхлапатаць ільготу меншаму хлапцу. Але гэта справа яму нічога не дапамагла: сын пашоў служыць у Чырвоную армію. Каб вярнуць гэту мэтрычную даведку назад, гр-н С. зьвярнуўся ў вайсковы аддзел пры гарсавеце з належнай заявай. Працаўнік, прачытаўшы заяву, сказаў, што трэба непасрэдна падаць заяву ў Менск.

Ну, калі так, дык добра. Яшчэ ў лютым гр-н С. накіраваў заяву ў Менскі арквенкамат. Апошні з свайго боку не затрымліваў справы і 14 сакавіка пры адносіне за № 1521 накіраваў заяву С. Магілёўскаму цэнтрархіву, каб апошні вярнуў непасрэдна гр-ну С. мэтрычную даведку. Своечасова ён паведаміў гр-на С., што заява накіравана ў Магілёў. Пратрымаўшы справу месяц, Магілёўскі архіў паведамляе гр-на С., што заява і адносіна Менскага АВК накіравана ў Менскі цэнтрархіў пры адносіне № 207 для выкананьня. Недачакаўшыся канца гэтай цягніны, гр-н С. едзе сам у Менскі архіў, каб высьветліць, дзе знаходзяцца справы Барысаўскага АВК, каб атрымаць даведку на месцы. Зьвярнуўшыся з адносінамі АВК і Магілёўскага архіву ў Менскі архіў, ён атрымаў адказ, што спраў Барысаўскага АВК няма.

— Дык дзе-ж, таварыш, гэтыя справы знаходзяцца?

— Я-б вам сказаў, дзе яны, але я сам ня ведаю.

Цяперь гр-н С. сапраўды ня ведае, куды зьвярнуцца, каб атрымаць патрэбны яму дакумант.

А кажуць, што ў акругах няма бюракратызму і валакіты.

Я. Жала.

„СПАСЕНИЕ НА ВОДАХ" МЕНСКАГА КАМГАСУ.

Такая арганізацыя калісьці існавала пры моры і вялікіх рэках. Самае значэньне назвы сьведчыць аб тым, што яна ставіла сваёй мэтай ратаваньне ахвяр ад валзяной стыхіі.

У нас, у Савецкай Беларусі, праўда, няма ні мора, ні нават такой ракі, разьлюшаныя хвалі якой маглі-б праглынуць параходы з пасажырамі. Аднак, па мілasьці Менскага камгасу і ў нас можа арганізавацца такое т-ва ў сталіцы БССР—Менску.

Праўда, з геаграфіі ўсім вядома, што Менск—горад сухавенны, але ў вывіку праведзеных каналізацыйных работ Замкавая вуліца абярнулася ў сапраўдзнае мора. Досыць здарыцца дажджу, як увесь гэты райён Менску заліваецца вадой.

Трэба меркаваць, што Менскі камгас занадта захапляецца вэнэцыянскімі каналамі з іх гандолямі.

Але Менск не Вэнэцыя. Мы ня можам дапусьціць, каб па нядбайству камгасу, як толькі захмурнее неба, насельніцтва цэлага райёну павінна зьбірацца наўцёкі ў іншыя райёны.

25-га верасьня, пасьля дажджу, уся Замкавая вуліца абярнулася ў сапраўднае возера. Але мала гэтага нішчасьця: да гэтага часу яшчэ незасыпаны ямы. Пераходзячы вуліцу, адна жанчына ледзь не ўтапілася. Як яе выратавалі бяз лодкі, нам невядома, але мы ня ўпэўнены, што сёлета нехта ня ўтопіцца ў гэтых ямах.

Зараз пакуль што суха, а які выглядзе прыме гэты райён, калі пачнецца паласа дажджоў?

Аб гэтай справе пісалі летась. Камгас і гарсавет стараў нейкія камісіі, а справа ні на крок не пасунулася наперад. Людзі як купаліся ў гразі, так і зараз купаюцца ў ёй.

Мы патрабуем бездакладнага дасьледваньня гэтай справы.

Калі „Водаканал" зрабіў памылку 2 гады таму назад, дык да гэтага часу яе трэба было выправіць.

ПРЫЗЫЎ 1906 ГОДУ.

Прызыў праходзіць добра.

Ва ўсіх сельсаветах 4 прызыўнога вучастку, куды ўваходзяць тры раёны: Смалявіцкі, Лагойскі і Астрашыцка-Гарадзецкі, своечасова былі праведзены сходы прызыўнікоў з пытаньнямі—аб міжнародным становішчы і задачах Чырвонай арміі і выбары прадстаўнікоў для жэраб'ёўкі. Сходы прайшлі добра, але дрэнна, што ў некаторых мясцох каапэратывы ў час правядзеньня сходаў прадавалі гарэлку. Вінаваты тут сельсаветы, якія на мясцох не дагледзелі за гэтым.

Жэраб'ёўка адбывалася два дні: 5 і 6 верасьня. Апрача прадстаўнікоў, на жэраб'ёўку шмат якія прызыўнікі зьяўляліся самі. Прызыўная камісія пачала сваю працу 17 верасьня. Прызыўнікі зьяўляюцца своечасова, за выключэньнем 1-2 проц. спазьненьня, але гэта—тыя т. т., якія знаходзяцца надта далёка. Прыяжджаюць яны ў той-жа дзень, калі трэба, але з спазьненьнем, ім прыходзіцца праходзіць камісію заўтра.

П'янства і хуліганства сярод прызыўнікоў не наглядаецца.

Настрой добры. Некаторыя зьяўляюцца раней, чым трэба па жэраб'ю і просяць, каб іх прынялі ў Чырвоную армію. Ёсьць такія т. т., якія адмаўляюцца ад прадстаўленых льгот. Прызыўнікі запэўніваюць, што будуць добра абараняць заваёвы Кастрычніка і што ў любы момант могуць выступіць супроць тых, хто адважыцца напасьці на Савецкі Саюз.

У арганізаваным „агіт-пункце», куды прызыўная камісія выпісвае шмат газэт і часопісаў, кожны дзень дэжурыць праваабаронца і вылучаныя 2 таварышы ад райкому партыі, якія даюць адказы і даведкі па ўсіх пытаньнях, якія цікавяць прызыўнікоў, устрайваюцца галосныя чыткі. Смалявіцкае спажывецкае т-ва арганізавала часовую сталовую спэцыяльна для прызыўнікоў, дзе яны могуць піць гарбату, купляць харчы значна таньней, чым у прыватніка.

Прызыўнікі ідуць дарэмна на ўсе пастаноўкі, вечары і кіно, якія адбываюцца ў Нардоме.

Б. Маркевіч.

Адмаўляюцца ад льготы.

Прызыў у Гомельскай акрузе праходзіць пасьпяхова. Яўка прызыўнікоў складае 94 проц. Не зьявіліся выключна тыя, якія выбылі з округі на заработкі, або знаходзяцца пад судом і сьледзтвам.

Як дасягненьне, трэба адзначыць, што ў бягучым годзе не наглядалася п'яных прызыўнікоў, якія зьяўляліся ў камісіі.

Мэдычны абгляд праходзіць вельмі дасканала. Камісія адбірае ў пэрагі Чырвонай арміі самых здаровых. У ня поўных выпадках прызыўнікі накіроўваюцца на іспыты і атрымоўваюць адтэрміноўку. Настроі прызыўнікоў бадзёрыя. Шмат якія з іх адмаўляюцца ад льгот першага і другога разраду. Кожны мае імкненьне папасьці ў спэцыяльныя вайсковыя часьці.

На прызыўных пунктах арганізаваны каапэрацыйныя ларкі, для забесьпячэньня патрэбнымі харчамі прызыўнікоў, бібліятэкі і сталы даведак.

Некаторыя арганізацыі яшчэ ня досыць стала разгарнулі сваю працу, ТДА-Авіяхім толькі цяпер пачаў працу па арганізацыі хімічных кутко́ў. Культурнае абслугоўваньне кіно-перасоўкамі таксама яшчэ не разгорнута. Памяшканьні прызыўных камісій, за выключэньнем Уваравіч, трымаюцца чыста. Доктар, якому даручана мець санітарны нагляд і які прымае ўдзел у прызыўной камісіі, не зьвяртае належнай увагі санітарнай справе. Прапановай акруговага ваенкамату гэты недахоп ліквідуецца.

В.

На Пухавіцкім прызыўным пункце.

17 верасьня першы дзень прызыву моладзі 1906 г. К прызначанаму часу поўнасьцю зьявіліся тыя таварышы, на якіх выпалі першыя жэраб'ёўныя нумары на гэты дзень. Сабраўшыся ў агітпункце, прызыўнікі чакаюць 9-й гадзіны—пачатку работы прызыўной камісіі, Разьвешаныя на сьценах лёзунгі і адозвы прыцягваюць увагу прызыўнікоў. Некаторыя з іх прагледаюць газэты, выбіраюць кніжкі. Т. т., якія прышлі здалёк, «аблягчаюць» свае торбачкі ад хлеба і сала. На агітпункце прызыўнікі задаюць пытаньні: ці вялікі сёлета набор у кадр, ці будуць браць у кавалерыю, у тэхнічныя часьці і г. д., на што даюцца адказы.

Справавод па прызыўных картках выклікае першых дзесяць чалавек у другі пакой. Там яны па чарзе разьдзяюцца і пранумэруюцца ў пакой прызыўной камісіі.

— Падходзь, падходзь, браток, я цябе памераю і паважу,—падклікае сябра камісіі.

Дактары ўважліва абглядаюць і выслухоўваюць.

Старшыня камісіі шэрагам пытаньняў зьлічае з дакумэнтамі прызыўніка і абвяшчае аб назначэньні ў часьці. Здаволены, паварачваецца і выходзіць прызваны, а за ім падходзіць другі.

— Дзе вам хочацца служыць?—між іншым, пытае камісія.

— Ваша воля, куды назначыце! Усёроўна, усюды трэба абараняць сваю бацькаўшчыну.

Так павольна, парадкам, дзень за днём праходзяць групы моладзі праз прызыўную камісію, атрымоўваюць дакумэнты, з якімі ў хуткім часе яны ўльлюцца ў вялікую пачасную сям'ю—Р.-С. Чырвоную армію на зьмену сваім старэйшым таварышам.

Я. Івашын.

Прызыў у Чавускім раёне.

З 6-га верасьня распачала сваю працу райённая прызыўная камісія.

З боку райённых установаў і арганізацый зьвернута вялікая ўвага абсталяваньню прызыўнога пункту.

Як ніколі весела каля прызыўнога пункту. Прызыўнікі зьяўляюцца своечасова. З вялікай ахвотай яны жадаюць служыць у Чырвонай арміі.

Сынкі кулакоў і заможнікаў ідуць сваёй «хоўрай» ды „зюзюкаюць» ціханька: «вось, каб як-небудзь што зрабіць, каб забракавала прызыўная камісія, ды не забрала на два гады». На прызыўным пункце гэтыя «сынкі» туляцца, дрыжаць і баяцца невядома чаго.

Як толькі выходзіць з прызыўнога пакою камсамолец, або бядняк, дык сынкі заможнікаў пытаюцца: „ну, як цябе забралі, ці не?

Па думцы заможнікаў, якую яны выказваюць, бедняку ў прапягу двох гадоў у Чырвонай арміі будуць „круціць шкуру". Зусім іншае адказвае ім прыпяты бядняк. Пакуль ён тлумачыць, што там навучаюць моладзь, як будаваць і абараняць сацыялістычную краіну, яго падхватваюць на «ура» прынятыя з ім таварышы і крычаць—няхай жыве Сенька—сын пастуха, будучы чырвоныармеец і чырвоны камандзір!

Чамаданаў В.

Іл. БАРАШКА.

ТАК ЛЮДЗІ ЖЫВУЦЬ.

1. БАЛ-АГОЛ І АЎТОБУС.

Праезд на аўтобусе з Менску ў Чэрвень каштуе тры рублі пяцьдзесят капеек. Балагол бярэ таньней. Ён робіць вам уступку на адзін рубель, бо ведае, што куды там уганяцца яму, балаголу, з шофэрам у кожанцы. Тут канкурэнцыі быць ня можа...

Між іншым, ці ведае чытач, скуль узялося ў беларускай мове звыклае, штодзённае слова—балагол? Напэўна не. Аказваецца, што гэта слова стараяўрэйскага паходжаньня. На стара-яўрэйскай мове «бал»—азначае гаспадара, а «агол»—падводу; гэткім чынам і склалася гэта характэрнае, неадменнае слова „балагол", што азначае—гаспадар падводы. А цікава так пакапацца іншы раз у простых, здаецца зразумелых, і адначасова незразумелых словах...

Са зьяўленьнем аўтобусу традыцыйная прафэсія беларускага балагола зьнікае. «Багатыя» балаголы ўжо ня хочуць ехаць разам з сваімі падводамі цэлых дванцаць чатыры гадзіны. Яны кажуць:—Пашто мне ехаць з Менску ў Чэрвень на падводзе, калі ёсьць аўтобус. Я на аўтобусе за тры гадзіны да Чэрвеня даеду, а заместа сябе лішні груз на падводу ўскіну—адно на адно выходзіць...

Але, зразумела, на аўтобусе ня ўсе балаголы езьдзяць.

З мной на аўтобусе едзе старэнькі яўрэй—балагол Абрам. Маленькі, сівенькі з вялікай лапацістай барадою. Заходзіць сонца. І Абрам ціханька ўстае, забіваецца ў куточак аўтобусу і пачынае маленьне. Ён моліцца доўга, амаль праз усю дарогу... Маліцца яму ніхто не перашкаджае і ён увесь час, ківаючы галавою, ляпеча вуснамі звыклыя, завучаныя словы... Толькі калі трапіцца на дарозе выбоіна, і аўтобус падскоча, як свавольны хлапчук, Абрам перапуджанымі вачмі глядзіць на мяне, маладога...

2. ЧЭРВЕНЬ—ГОРАД.

Абружаны чорным колам лесу і тарфяных балот, прыгорбіўся Чэрвень—цэнтр райёну. Цяпер Чэрвень толькі райённы цэнтр, а раней, раней, ого, чым зьяўляўся Чарвень! Праўда, у той час быў Ігумен, быў і Ігуменскі павет... Жыхароў у Чэрвені—пяць тысяч, ці каля гэтага...

Санліва, спакойна плыве жыцьцё ў райённым цэнтры. Жыхары ведаюць адзін другога вельмі добра, правінцыяльнымі плёткамі перапоўнены гарадок, і зьяўленьне новага чалавека ў горадзе адразу прыкмячаецца. Так здарылася і са мною. Калі я праходзіў па цэнтральнай вуліцы гораду, дзе да гэтых часоў крамнікі сядзяць на зэдліках перад сваімі малюпасенькімі, карыкатурнымі крамкамі «дробнага гандлю», «спажывецкіх прадуктаў» і галянтарэі, дык вочы гандляроў і гандляраж падазрона аглядалі маю постаць, паказвалі на мяне пальцамі і перакліканіся:

— Хапэ!

— Вос вілтцаг?

— Кукт, а наер фінінспэктор...

З усьмешкай я праходзіў паміж гэтых сярэднявяковых крамнікаў, не разумеючы, чаму гэта мяне прымаюць за фінінспэктара. Але потым, як выявілася, пра гэта ніжэй будзе чытаць чытач, Чэрвень застаўся бяз фінінспэктара, і крамнікі жывуць чаканьнем новага «камісара патэнтных спраў»...

Вуліц у Чэрвені нямнога—іх можна лёгка пералічыць... На пляцу Волі—некалькі каменных будынкаў, у якіх зьмяшчаюцца «ўрадавыя ўстановы», а рэшта—драўляныя хаткі з невялічкімі садочкамі на задворках, з агародамі для ўласнага спажываньня. Маецца ў Чэрвені і царква, і касьцёл і некалькі сынагог, аднак новая пажарніцкая вежа перарасла іх і высака ўзьнімаецца панад гарадам—небясьпечная справа пажар у драўляным горадзе!

Пасьля звычайнага руху ў вялікіх гарадох неяк нудна глядзець на пустыя вуліцы маленькага Чэрвеня. Тамсам прамільгне чалавек, ці кабеціна з вядром, а то сустрэнуцца двое абываталяў, павольна падаюць адзін другому руку—вітаюцца, а потым выстойваюць па гадзіне, гутарачы і пра палітыку, і пра эканоміку, і пра сямейныя непарадкі агульнага іх знаёмага, і з асаблівым смакам выхваляюцца пра загатаваныя на зіму гатункі наліўкі, запрашаючы адзін другога, калі будзе час, пакаштаваць, пасмакаваць...

Амаль што ўсе вуліцы ў Чэрвені брукаваныя і гэта стварае даволі прыемнае ўражаньне на прыежджага. Няма тэй гразі, якую можна яшчэ ўгледзіць у некаторых нашых райённых цэнтрах. Увечары соткамі электрычных ліхтароў ілюмініраваны вуліцы гораду—ствараецца ўражаньне, што горад багаты электраэнэргіяй і яна тут каштуе танна, а таму ўвесь зьлішак выкарыстоўваецца для асьвятленьня пустых вуліц... Але ня так ужо танна каштуе Чэрвеню гэта «удовольсьцьвіе», як мы дазналіся пасьля. Гасьцініц у горадзе—адна, дый і тая Віленская. Прыватная. Райённы камгас, відаць, ня мае сіл і сродкаў узяць на сябе камунальнае абслугоўваньне прыежджых, але нічога ня зробіш. Прыходзіцца чакаць...

3. БОЙ—ЗАДАНЬНЕ.

Адно з баявых заданьняў для чэрвенскай улады—гэта распаўсюджваньне пазыкі індустрыялізацыі. Падпіска праходзіць з нячуваным посьпехам. Рабочыя і служачыя ахоплены на ўсе сто процантаў, праводзіцца кампанія па ўцягненьню сялянства на падпіску—і там маюцца посьпехі.

На 19 верасьня г. г. па Чэрвенскаму райёну праведзена падпіска на 20.115 руб., з якіх 13280 р. бяспроцантнай пазыкі, а інакш кажучы, гэта складае звыш 120 процантаў заданьня. Па пытаньню аб падпісцы на пазыку праведзена ў райёне сто шаснаццаць агульных сходаў. Разьмяшчэньне падпіскі на пазыку сярод сялянства праводзіцца, галоўным чынам, праз мясцовыя арганізацыі—і гэта дае станоўчыя вынікі. Арганізаваныя ў каапэратывы, камітэты сялянскай узаемадапамогі—сяляне падпісваюцца значна лепш, чым неарганізаванае, на агульных сходах. Настаўніцтва прымае актыўны ўдзел у распаўсюджваньні пазыкі—аб гэтым апавядае наступны факт:

Настаўніцтву Раваніцкага сельсавету было даручана распаўсюдзіць пэўную колькасьць пазыкі, прычым была пастаўлена адпаведная кантрольная лічба. Сабраўшыся на агульны настаўніцкі сход, настаўнікі падпісаліся і якраз выканалі кантрольную лічбу самі, паведаміўшы, што кантрольная лічба ўжо выканана імі, і яны цяпер праводзяць падпіску сярод сялянства, перастуміўшы ўжо кантрольную лічбу.

Цяпер у райёне атрыманы аблігацыі, і асабліва ўвага зьвяртаецца райвыканкомам на падпіску сярод сялянства за налічны разрахунак.

— Мы самі ня будзем хваліцца,—зазначыў мне старшыня райвыканкому т. Будкевіч,—няхай нас пахваляць. Зроблена ўсё, што магчыма зрабіць, а таму і вынікі добрыя.

Раз так, дык прыходзіцца за справу распаўсюджваньня другой пазыкі індустрыялізацыі Чэрвеншчыну пахваліць...

4. ЯК БДВ ПРАВОДЗІЦЬ... РУСІФІКАЦЫЮ.

Сярод прыватных крамак па вуліцы

Дайце добры хлеб.

Вельмі часта можна пачуць скаргі на якасьць хлеба, які выпускаецца менскім хлебазаводам. Часта хлеб бывае сыры, чорствы, гарэлы.

Дзеля таго, каб выявіць прычыны гэтага, 28 верасьня на хлебазаводзе адбыўся сход упаўнаважаных супольна в праўленьнем МЦРК.

Аб дзейнасьці хлебазаводу зрабіў даклад дырэктар заводу т. Кеніг. Дакладчык адзначыў, што хлеб часта бывае няўдалым таму, што мука бывае розных сартоў; на якасьці хлеба таксама адбіваецца некваліфікаванасьць рабочых. Старэйшыя майстры часта не спраўляюцца з сваёй работай. Апошняя прычына вынікае часткова яшчэ і таму, што ім прыходзіцца працаваць кожны дзень в новай брыгадай рабочых, што, бязумоўна, адбіваецца на якасьці хлеба.

Хлеб не належны ўдаваўся яшчэ і таму, што завод вельмі сьпяшаўся, калі бывалі вялікія чаргі.

Выступаўшыя рабочыя адзначалі, што трэба ўжыць захады да палепшаньня якасьці хлеба. Пара ўжо спыніць выпечку гарэлага альбо сырога хлеба.

Нездавальняючымі таксама вынуляюцца санітарныя ўмовы на заводзе: рабочыя, якія вымаюць хлеб з фургонаў, не апранаюцца ў спецыяльнае адзеньне, а выконваюць сваю работу ў сваім звычайным адзеньні.

МЦРК павінен зьвярнуць увагу на якасьць муки, якая дасцца заводу, і не даваць туды дрэннай мукі. У райённых крамах хлеб трэба дастаўляць своечасова, а не з вялікім спазьненьнем, як гэта бывае часта зараз.

На ўсе гэтыя хібы зварачвалі увагу выступаўшыя ўпанаважаныя і прасілі МЦРК у далейшым зьнішчыць іх.

Суд.

СВАЯ САРОЧКА БЛІЖЭЙ К ЦЕЛУ.

У вёсцы Асьняк, Гроскага раёну, сяляне загачвілі, што ўпаўнаважаны мясоў мясповага значэньня Алесь Лавоўскі—шкурнік.

Нельга было адразу зразумець, за што пасьпаўся такі паклёп на Лавоўскага, але гутарка аб Лавоўскім на спыцілася—і амаль у кожнай хаце намінані грэшную душу Лавоўскага.

Некалькі разоў мясьнік Логіш заходзіў да Лавоўскага, прасіў яго прыняць належныя захады і дапамагчы спыніць самавольныя парубкі мясповага лесу, але Лавоўскі са злосьцю адказаў Логішу.

— Не твая справа—сякуць лес, хай сякуць, лес гэта той-жа грыб—сёньня няма, назаўтра вырасьце.

Вядома, калі так разважаў Лавоўскі, мясповаму лесу не паздаровілася. За час службы Лавоўскага гай сасновага лесу ад самавольных пасечак парадзеў на 828 пнёў каштоўнасьцю на 595 руб. 52 кап.

Акрамя таго, на руках Лавоўскага ад продажы лесу былі грамадзкія грошы, якія ён трымаў у кішэні, у сельсавет не здаваў і гэткім чынам на свае асабістыя патрэбы скарыстаў 94 руб., незаконна сьпісаўшы іх у лік пэнсіі за нядбайную службу.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў: Алеся Вінцэсьва Лавоўскага на адзін год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

ЗАГАДЧЫК МАЙСТЭРНЯЎ—РАСТРАТЧЫК.

Амаль год Міхась Сакалоўскі, займаючы пасаду загадчыка майстэрняў Менскага цэнтральнага папраўчага дому, як кажуць, лавіў рыбу ў мутнай вадзе.

У перыяд часу службы Сакалоўскага—майстэрні папраўчага дому разварачваліся, Сакалоўскі атрымліваў значныя авансы на абсталяваньне майстэрняў і на пакупку матар'ялаў, але ніколі на прыход авансаў не запісваў і грашовая справаздача вялася па сямейнаму.

У выніку такой працы, калі была вытварана рэвізія, выяўлена наступнае: водпуск матар'ялаў фабрыкатаў рабіўся па цэнцы на вока, бяз калькуляцыі, вучоту прадукцыі па цэхах зусім не было, атрыманыя ад розных устаноў грошы ў суме 1438 руб. за выкананьне заказаў на прыход не запісаны і растрачаны загадчыкам Сакалоўскім.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Міхася Міхасёва Сакалоўскага на два гады і 6 месяцаў зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

Дапасаваўшы да асуджанага амністыю ў адзнаку 10 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, суд скараціў пакараньне напалову.

ХРОНІКА.

Абсталяваньне новага Дому Селяніна заканчваецца.

Абсталяваньне Цэнтральнага Дому Селяніна ўжо заканчваецца. Зараз канчаюць устанаўленьне цэнтральнага ацяпленьня, каналізацыю, электрычную праводку, вадаправод.

Мэбля для Дому робіцца заводам «Дрэваапрацовачнік». Праводзіцца абсталяваньне музэйных аддзелаў Дому; музэйныя аддзелы па прамысловасьці і сельскай гаспадарцы зараз папаўняюцца новымі экспанатамі.

Дом будзе адчынен у гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Утварэньне насенных фондаў.

ЦК камітэту сялянскай узаемадапамогі зараз робіць захады да своечасовага утварэньня насенных фондаў да весьнавой сяўбы наступнага году. Кожны сельскі камітэт павінен павялічаць існуючыя фонды на 150-200 пуд., райённыя камітэты павінны давесьці свае фонды да 1000 пуд.

Апрача гэтага, робяцца захады да своечасовага спагнаньня запазычанасьці і сяброўскіх узносаў.

Усе скончыўшыя пэдфак БДУ атрымалі працу.

Сёлета пэдфакам Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту было выпушчана 300 настаўнікаў па розных галінах.

Па вестках, Наркамасьветы БССР прызначыў усіх скончыўшых на пасады.

У сучасны момант адчуваецца недахоп у настаўніках лінійных, прыродаведаў і матэматыкаў.

Камсамол—на фронце ліквідацыі няпісьменнасьці.

Культурны паход камсамолу па Менску шырока разгарнуўся. Да гэтага часу камсамольскімі атрадамі па ліквідацыі няпісьменнасьці ўзята на вучот 805 няпісьменных і 1837 малапісьменных. Для ліквідацыі няпісьменнасьці гарадзкім райкомам камсамолу будзе выдзелена 70 чал., Ляхаўскім—80 чал. і Кастрычнікаўскім—50 чал.

Выдзеленыя таварышы будуць накіраваны для працы ў ліквпунктах.

Удзел тэатральна-мастацкіх сіл у культпаходзе камсамолу.

Менскі акругком ЛКСМБ дагаварыўся з ЦП саюзу мастацтва аб удзеле тэатрально-мастацкіх сіл у культпаходзе камсамолу.

14-га кастрычніка ў «Дзень Ураджаю» група артыстаў у ліку 30 чал. выязджае ў бліжэйшыя вёскі Менскай акругі, дзе імі будуць дадзены некалькі мастацкіх пастановак.

У 2-й палове кастрычніка ў Менску артыстамі будуць пастаўлены некалькі вечароў для рабочай моладзі, збор сродкаў ад якіх пойдзе ў карысьць ліквідацыі няпісьменнасьці.

Папаўненьне зоолёгічнага музэю Інбелкульту.

За летні час зоолёгічным музэем Інбелкульту былі арганізаваны шэраг экспедыцый па вывучэньню фауны Беларусі, а таксама па зьбіраньню адпаведных матар'ялаў для папаўненьня музэю.

Экспедыцыі былі наладжаны ў Гомельшчыну, Мазыршчыну і Меншчыну. У Мазыршчыне сабрана вялікая калекцыя птушак, у Гомельшчыне і Меншчыне—калекцыі пасьпіножак (насякомыя) і гадаў (гадзюкі, жабы).

Курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў для авіяхіматрадаў.

Менскі акрсавет ТДА-Авіяхіму пастанавіў арганізаваць курсы па падрыхтоўцы начальнікаў авіяхіматрадаў і інструктароў для хэмічных гурткоў.

У сучасны момант праводзіцца набор на гэтыя курсы. Усяго будзе прынята 40-50 чал. Курсы будуць працаваць у працягу двох месяцаў.

Менскі дзень.

Белсельтрэст атрымаў крэдытаў: 100 тысяч руб. на ўборку і абмалот ураджаю, 5610 руб.—на мэліярацыйныя працы ў 13-ці саўгасах і 40 тысяч руб. на рамонт сьвінарнікаў у саўгасах.

На гідратэхніку і мэліярацыю адпушчана Белсельбанкам Бабруйскай акрузе 3000 руб. на гідратэхнічныя патрэбы Тураўскай Дасьледчай Станцыі і 2000 руб. для мэліярацыйных т-ваў.

Рачавая лётарэя на карысьць бяспрытульных дзяцей адбудзецца ў Менску 28-га кастрычніка. Складзена розыгрышная камісія, у якую ўваходзяць прадстаўнікі зацікаўленых устаноў.

Шавецкая майстэрня на 40 бяспрытульных дзяцей у хуткім часе арганізуецца ў Менску. Майстэрня будзе мець 2 аддзяленьні: загатовачнае і абутковае.

Чыгуначныя навіны.

У сувязі з аб'ядначьнем вакзалаў МБВ і Заходніх чыгунак, с 1-га кастрычніка станцыя «Менск—Заходняя» будзе звацца «Менск—пасажырская», а станцыя МБВ—«Менск-таварная». Усе апэрацыі па абслугоўваньні пасажыраў (прадажа білетаў, выдача багажа і г. д.) будуць сканцэнтраваны на станцыі „Менск—пасажырская", а таварныя апэрацыі—на станцыі «Менск—таварная».

Першым поездам на аб'яднаны вакзал «Менск—пасажырская» прыбудзе з Масквы заўтра, 1-га кастрычніка, пасажырскі цягнік № 3 а 7-й гадзіне ўвечары; другім поездам прыбудзе з Негарэлага кур'ерскі таксама 1-га кастрычніка. Пасьля гэтага будзе рэгулярны рух паязду ува ўсе бакі. На вакзале «Менск пасажырскі» адчынена 2-я білетная каса і справачнае бюро.

З СЁНЬНЕШНІМ НУМАРАМ РАССЫЛАЕЦЦА ДАДАТАК ДА „САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ" «ПРАЦАЎНІК АСЬВЕТЫ» № 10.

КУЛЬТУРНЫЯ НАВІНЫ.

Рэстаўрацыя каштоўных карцін.

Мастак Віер выканаў па заданьню БДМ даволі значную работу па рэстаўрацыі (адноўленьню) цэлага шэрагу вельмі каштоўных, але папсутых карцін і ікон.

Некаторыя карціны флямандзкага пісьма былі так папсаваны, што нават ня было надзеі паправіць іх. Зараз-жа, пасьля рэстаўрацыі, карціны выглядаюць вельмі добра, і толькі дужа вопытнае вока можа заўважыць паправкі.

Таксама вельмі ўдала папраўлены некаторыя іконы старога беларускага пісьма.

Стаянка бронзавага веку.

Археолёг Ляўданскі выявіў каля Банцараўскага гарадзішча стаянку бронзавага веку. Тут знойдзена шмат рознай пасуды і крамнёвых прыладаў.

Магільнікі крывічоў.

Каля в. Зарэчча (недалёка ад Менску) ёсьць група курганоў (107). Раскопкі некалькіх курганоў паказалі, што ў іх пахаваны насельнікі 10-га стагодзьдзя. Пахаваньне сустракаецца в трупаспаленьнем і звычайнае.

У некаторых курганох з трупаспаленьнем знойдзены вурны і папсаваныя агнём рэчы: бранзалеты, пацеркі, колцы, нажы, тапары жалезныя і інш. У адным кургане в звычайным пахаваньнем знойдзены: нож, кап'ё, вядро драўлянае з жалезнымі абручамі і інш. рэчы.

Культура гэтых курганоў блізка да культуры заслаўскіх, але трохі ранейшая.

Гэта магільнікі крывіцкіх славян.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

Паважаны таварыш рэдактар.

У надрукаваным у № 210 (3017) газэты „Зьвязда" ад 12-га верасьня г. г. і газэты «Савецкая Беларусь» № 211 ад 13-га верасьня г. г. у маім дакладзе аб „ЗАДАЧАХ ПАРТЫЙНАЕ ПРАЦЫ НА БЛІЖЭЙШЫ ПЭРЫЯД" у ліку арганізацый, дзе кіраўнічая верхавіна разлажылася, названа і Сураская арганізацыя. Я павінен заявіць, што такая характарыстыка ў адносінах да кіраўніноў Сураскае арганізацыі направільна. Усе факты, якія ў мяне маюцца і якія мною былі агалошаны на Пленуме ЦК КП(б), не даюць ніякіх падстаў для такога абвінавачаньня ў адносінах да кіраўнічае групы сураскіх таварышоў і ў самым дакладзе ў гэтай сувязі Сураж мною ня быў названы.

Указаньне ў надрукаваным маім дакладзе на Сураж у зьвязку з гэтым магло зьявіцца толькі таму, што, з прычыны вялікае перагружанасьці працаю, я ня мог сам рэдагаваць даклад. Па гэтай прычыне спазьнілася і маё выпраўленьне.

З камуністычным прывітаньнем В. КНОРЫН.

Апавяшчэньні.

— У панядзелак 1-га кастрычніка а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні партгабінэту адбудзецца кансультацыя на тэму:

1) Навучальны план адзінай партыйнай школы на 28-29 год.
2) Як рыхтавацца да заняткаў.
3) Мэтад распрацоўкі 1-й тэмы АПШ.

Яўка для ўсіх прапагандыстаў Адзінай Партыйнай Школы і рабочых прапагандыстаў абавязкова.

— У панядзелак, 1-га кастрычніка, а 7 гадзіне, у ПЭДГАБІНЭЦЕ адбудзецца сход фізыка-матэматычнага гуртка настаўнікаў г. Менску.

КУТОК ВУЧОНЫХ.

У нядзелю, 30-IX—даклад праф. У. І. Пічэты на тэму: «Гістарычны тыдзень у Бэрліне і гістарычная канфэрэнцыя ў Осло». Пач. а 8 з пал. гадз. увеч.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 30-IX-1928 г.

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—76, куп. 4—74.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—12, куп. 5—10.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—2, куп. 5—00.
Абл. 10 пр. паз. 27 году — прад. 25,33, куп. 25—23.
Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 121, 75, куп. 119,75.
Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 104—05 куп. 104.

Часова вык. абав. адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ДРУГІ КОНКУРС

Кантора газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" абвяшчае

ДРУГІ КОНКУРС

НА ЛЕПШАГА ЎПАЎНАВАЖАНАГА, ВЫЛУЧАНАГА МЯСЦКОМАМІ ЦІ ГРУПКОМАМІ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ Ў СПРАВЕ РАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ ГАЗЭТЫ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

Конкурс абвяшчаецца з 1-га жніўня і будзе цягнуцца да 31-га сьнежня г. году.

Уся прысланая ўпаўнаважанымі падпіска, пачынаючы з 1-га жніўня да 31 сьнежня, будзе залічана на конкурс. Падпіску можна зьбіраць на жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад і сьнежань месяцы г. г., а таксама і на ўвесь 1929 год.

Падпіска прымаецца ўпаўнаважанымі як за налічны разрахунак, так і ў крэдыт (крэдытная падпіска ўпаўнаважанымі праводзіцца на ранейшых умовах).

Падпіска зьбіраецца ня толькі сярод асьветнікаў, але і сярод іншага жыхарства і ўсіх устаноў і арганізацый.

УМОВЫ КОНКУРСУ:

ЗА ЗБОР ПАДПІСКІ БУДУЦЬ ВЫДАНЫ ПРЭМІІ:

За 1300 экзэмпляраамесяцаў і больш прэмія 160 руб.

ад 1300 да 1150	— 140 руб.	ад 400 да 300	— 30 руб.
ад 1150 да 1000	— 120 »	ад 300 да 200	— 20 »
ад 1000 да 800	— 90 »	ад 200 да 100—бясплатна газэта «Савецкая Беларусь» на год.	
ад 800 да 600	— 75 »		
ад 600 да 400	— 50 »		

Лік прэмій неабмежаваны. Такім чынам, большую прэмію могуць атрымаць некалькі ўпаўнаважаных.

Прэміі паступаюць на карысьць упаўнаважаных, а на карысьць мясцкому застаўляецца на месцы 15 проц. ад сумы падпіскі.

Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены 15 студзеня 1929 году.

ЛЁТАРЭЯ ДЛЯ ПАДПІСЧЫКАЎ.

Разам з гэтым абвяшчаецца для ўсіх падпісчыкаў лётарэя 15-ГА СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 50 КАШТОЎНЫХ РЭЧАЎ.

У лётарэі будуць удзельнічаць толькі індывідуальн. падпісчыкі (установы ўдзелу ня прымаюць)

Умовы ўдзельнічаньня ў розыгрышы:

Усе падпісаўшыяся з 1 кастрычніка на 6 мес. атрымоўваюць 1 лётарэйны білет; на год—3 білеты. Лётарэйныя білеты будуць высланы ўсім падпісчыкам пасьля таго, як будуць імі прысланы квіткі аб здачы падпіскі, з дакладным адрасам, дзе бы яны ні падпісаліся: на пошце ці ў упаўнаважаных канторы.

У ЛЁТАРЭІ БУДУЦЬ РАЗЫГРАНЫ НАСТУПНЫЯ РЭЧЫ:

1 вэлёсыпэд
2 швэйныя нажныя машыны
3 фотоапараты
2 касьцюмы
2 самавары
5 прыёмаў
15 насьценных гадзіньнікаў
10 радыёпрыёмнікаў з коўным абсталяваньнем
10 камплектаў часопісі „Полымя" на 1929 г.

У конкурсную і лётарэйную камісіі вылучаны наступныя таварышы: ад рэдакцыі—рэдактар газэты Кудзелька Й., загадчык канторы Касьцюн, загадчык асьветніцкага аддзелу—Пашковіч, ад ЦП саюзу працасьветы Платун і Мельнік. Апрача таго, два прадстаўнікі ад раёнаў, сабраўшых больш лік падпіскі, і прадстаўнік РСІ.

КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	Ад аўторка, 25 верасьня, народны артыст рэспублікі І. М. МАСКВІН — у мастацкай карціне — „НАРАДЗІУСЯ ЧАЛАВЕК".
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	Ад аўторка, 25 верасьня, выключная намэдыя „ГЭТА МОЙ ЖАНІХ" вясёлая камэдыя ў 7 частках. У галоўнай ролі Оссі Асвальд. 3 сэансы: пачатак 1-га а 7 гадз. 30 хв., 2 — а 9 гадз., 3—а 10 гадз. 30 х. Каса адчынена ад 6 гадз.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Ад аўторка, 25 верасьня, — падвойная грандыёзная праграма — 2 баявікі ў адзін сэанс 2. Нямецкая мастацкая пастаноўка I. „АБУДЖЭНЬНЕ ЖАНЧЫНЫ" у 7 частках. З удзелам вядомай акторкі Марыі Якабіні. II. „ЗЬНІМАК НА ПЛЯЖЫ" трукавы фільм у 6 частках з удзелам вядомага Рычарда Толмэджа. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 хв.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	Амэрыканскі фільм „ТАЙФУН".

У ПАНЯДЗЕЛАК 1-га КАСТРЫЧНІКА.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
2 БАЯВІКІ — У АДЗІН СЭАНС — 2 БАЯВІКІ
1) „Штурман з прыбою"—драма ў 8 частках.
2) „Папашын сынок"—камэдыя ў 6 частках.
— УВЕСЬ ЗБОР—У КАРЫСЬЦЬ МОПР'у. —

МЕНСКІ АКРУГОВЫ ІНСПЭКТАР ГАНДЛЮ

даводзіць да ўсеагульнага ведама, што ім на падставе палажэньня аб гандлёвай рэгістрацыі 27 верасьня 1928 г. унесен ў кнігу „Е" 3-га разьдзелу гандлёвага рэестру СССР па Менскай акрузе пад № 27

„МАСЛАЖЫРСЫНДЫКАТ".

Прадмет дзейнасьці: продаж оптам прадукцыі сындыката.
МЕСЦАЗНАХОДЖАНЬНЕ: Менск, Камуністычная, 4.

Менскі Акр. Інспэктар Гандлю ГРАВІТ.

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ АСЬВЕТЫ БССР
АБВЯШЧАЕ
КОНКУРС на складаньне тыповых праектаў школьных будынкаў для БССР.

УМОВЫ КОНКУРСУ абвешчаны ў «ПРАГРАМЕ КОНКУРСУ», якую можна атрымаць у Народым Камісарыяце Асьветы (Менск, Пляц Волі 2-23, пакой № 15), або ў Акруговых Інспэктарыятах Народнае Асьветы.

Асобы, якія жадаюць прыняць удзел у конкурсе, павінны падаць свае праекты ў Наркамасьветы БССР не пазьней 1 лістапада 1928 г.
1—3.

Патрабуюцца агенты

Зьбірайце падпіску на часопісь „УЗВЫШША"!

УМОВЫ САМЫЯ ВЫГАДНЫЯ:

1. За падпіску на часопісь ад 1-га да 10-га камплекта — 50 к за камп.
2. За падпіску на часопісь ад 10-га да 25-га камплекта — 75 к. за камп.
3. За падпіску на часопісь ад 25-га да 50-га камплекта —1 р. 00 к. за камп.
4. За падпіску на часопісь ад 50-га да 100-га камплекта—1 р. 50 к. за камп.
5. За падпіску на часопісь ад 100-га і далей камплекта—2 р. 00 к. за камп.

Зьвяртацца штодзень ад 10 да 4 гадзіны ўвечары па адрасу:

Менск, Савецкая 63, 3 паверх, пакой № 1 Рэдакцыя „Узвышша".

Тыя, што жывуць ня ў Менску, могуць паведаміць пісьмова аб сваім жаданьні быць агентамі.

Внимание

химиков, строителей, хозяйственников, товароведов и учащихся

необходимая справочная — КНИГА —

Химические товары — и — строительные материалы.

В. О. Седлис. Под редакцией проф. А. А. Яковкина.

Книга содержит 350 стр. большого справочного формата, компактно набран. петитом в 2 столбца и дает исчерпывающие справочные сведения о химич. и москательных товарах и строительных материалах, их применении, способах добывания, химич. и технич. свойствах, сортировке, фальсификатах и суррогатах. Особое внимание уделено техническим условиям, стандартам и приемке. Ц. в переплете 6 руб.

Деньги и заказы адресовать—Ленинград, Ковенский пер. 2. Академическому Издательству.

ПРАДАЕЦЦА

зрыў-папера, макулатура і старыя газэты.

Спытацца ў канторы газэты „Савецкая Беларусь" (Рог вуліц Карла Маркса і Ленінскай, 2-гі дом Саветаў).

Балянс Віцебскага Гарадзкога Лёмбарду

АКТЫЎ — на 1-га кастрычніка 1928 году. — ПАСЫЎ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Прыватн. сума Руб.	К.	Агульн. сума Руб.	К.
1. ГРАШОВЫЯ СРОДКІ І КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ:				
А. ГАТОВЫЯ ГРОШЫ:				
а) Каса	3534	89		
б) Бяг. рах. у Камунбанку № 3	111	60		
Б. КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ:				
Адна абліг. 2-й выйгр. пазыкі в бяг. кун. тэрм. 15-XII-1926 г., 15-XII-1927 г.	5	54	3702	03
2. МАЁМАСЬЦЬ.				
Канцэлярскі інвэнтар па сьпісу			3748	10
3. МАТАР'ЯЛЫ.				
а) Друкаваны	151	—		
б) Гаспадарчы	62	50	213	50
4. УЛАСНЫЯ ТАВАРЫ.				
Заклады, якія засталіся за Лямбардам			938	03
5. ЗАКЛАДНЫЯ АПЭРАЦЫІ.				
Ссуды пад заклады № 4924			82374	85
6. ДЭБІТОРЫ.				
а) Розныя асобы і ўстановы	2615	57		
б) Авансы служачых	275	—		
в) Дэпанэнты—% % за хаваньне	222	52		
г) Пазычальнікі—% % за прасрочку	1066	14	4179	23
7. РОЗНЫЯ СУМЫ.				
а) Адлічэньне ў мясцовы бюджэт	5310	68	5337	22
б) Надзвычайныя сумы	26	54	1858	49
8. ВЫДАТКІ БЯГУЧ. АПЭРАЦ. ГОДУ				
УСЯГО			102351	45

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Прыватн. сума Руб.	К.	Агульн. сума Руб.	К.
1. КАПІТАЛЫ І ФОНДЫ.				
а) Статутны капітал			46227	22
б) Фонд палепшаньня быту рабоч. і служ.			110	92
в) „ амортызацыйны			374	81
2. ПАЗЫКІ І КРЭДЫТЫ.				
а) Па спец. бяг. рахун. у Камунбанку	8386	33		
б) Пад вэксалі	15000	—	23386	33
3. КРЭДЫТОРЫ.				
а) Розныя асобы і ўстановы	384	40		
б) Камітэнты за прададзен. рэчы в камісійн. магазыну	3091	40		
в) Заклададаўцы—перавыручка в таргоў	246	30		
г) Задаткі па камісійн. магаз.	85	—		
д) Пераходзячыя сумы	2	—	3809	10
4. ПРЫБЫТКІ БУДУЧ. АПЭР. ГОДУ.			1102	90
5. ВЫНІКІ.				
Прыбытак за 1926-27 апэр. год			27340	17
УСЯГО			102351	45

ЗА БАЛЯНСАМ:

1. Заклады па апэрацыі . . . . . Руб. 140094 —
2. Рэчы і каштоўн. на хаваньні . . . . . „ 3910 —
3. „ „ камісіі . . . . . „ 24442—25
4. Гарант. вэксалі ў забясьпеч. пазыкі . . . . . „ 30000 — Р. 198446—25

Рахунак прыбыткаў і страт на 1-га кастрычніка 1927 г.

ВІД СТРАТ (ПА ГРУПАХ)	Прыватная сума Руб.	К.	Агульная сума Руб.	К.
1. Утрыманьне штату	18640	53		
2. Канцэлярскія і тыпаграфскія выдаткі	1315	30		
3. Апал і асьвятленьне	1576	44		
4. Рамонт і абсталяваньне	1559	64		
5. Гаспадарчыя патрэбы	1692	32		
6. Падаткі і зборы	3706	40		
7. % па пазыках	2684	57		
8. Страхоўка і ўтрыман. памяшкан.	777	19		
9. Розныя страты	611	43	32563	55
ЧЫСТЫ ПРЫБЫТАК			27340	17
УСЯГО			59903	56

ВІД ПРЫБЫТКАЎ (ПА ГРУПАХ)	Прыватная сума Руб.	К.	Агульная сума Руб.	К.
1. % % па ссудах	46375	48		
2. Камісія па камісійн. магазын.	9656	62		
3. Плата па аукцыён. таргох	1966	42		
4. „ „ спэцыяльн. хаваньню	564	67		
5. Прыбытак ад рэалізацыі ўласных рэчаў	808	56		
6. Розны прыбытак	531	97		
УСЯГО			59903	56

Загадчык Лёмбардам КОЛКАЎ. Галоўны бухгальтар КУЛІБАНАЎ.

Балянс разгледжан Сталай Камісіяй Віцебскага Акрфа і зацьверджан Прэзыдыумам Віцебскага Гарсавету ад 27 ліпеня 1928 г. № 30.

Ст. Інспэктар Дзяржпрыбыткаў Віцебскага Акрфа БАСС.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Камсамольскі білет за № 72828 Хвасьвіча С. Г., выд. Барысаўск. акружкомам, кв. 1292.
— Справка аб працы, Бруханскага І. П., выд. Умтам, кв. 1292 (а).
— Пасьведчаньне ўзамен сяброўскай кніжкі Навіцкага І. К., выд. самат. прамысловым т-вам, кв. 1293.
— Мэтрычн. выпіс Ляўко А. С., выд. Менскім Загсам, кв. 1290.
— Канд. карт. за № 184 Старобінца Г., выд. Барысаўск. акружкомам, кв. 1291.
— Біржавы талён за № 809 Багдамава В. Г., выд. Біржай Працы, кв. 1288.
— Кваперац. кніжка Бельковіча І. К., выд. МЦРК, кв. 1289.
— Камсамольскі білет за № 15892 Цейтліна А., выд. Аршанскім акружкомам КСМ, кв. 1294.

Гаўлітбел 302. 1-я дзяржаўная друкарня